# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 29 (1520)
17 ліпеня 2021 г.

# "Узводзіць масты, а не сцены!"

**15 ліпеня адбылося ўрачыстае адкрыццё юбілейнага XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Свята асвятляюць больш за чатыры сотні акрэдытаваных прадстаўнікоў 43-х беларускіх і 33-х замежных СМІ з васьмі краін.**

**У сваім прывітальным слове на адрас фестывалю Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка заклікаў "узводзіць масты, а не сцены" між народамі і краінамі. Сапраўды, менавіта на гэта было скіравана з'яўленне "Славянскага базару ў Віцебску" на культурнай мапе Беларусі і свету, менавіта гэтыя мэты стаяць перад фестывалем і цяпер.**

*Працяг матэрыялу — на старонцы 16.*

*Працяг фестывальнай тэмы — на старонках 3 — 9.*

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

## Газета — рэгіёны — чытач

***— Пасля вымушанага гадавога перапынку фестываль "Белая Вежа" вяртаецца на сцэну Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы. Што плануюць паказаць гледачу?***

**Сяргей Панасюк, начальнік аддзела культуры Брэсцкага аблвыканкама:**

— Мы рады запрасіць гасцей на юбілейны 25-ты фестываль, які пройдзе з 10 па 18 верасня. З 1996 года "Белая Вежа" знаёміць са сцэнічнымі традыцыямі замежжа, сучаснымі сусветнымі тэатральнымі тэндэнцыямі і нацыянальным сцэнічным мастацтвам Беларусі. Сёлета фестываль прысвечаны 30-гадоваму юбілею Саюза Незалежных Дзяржаў. Да нас прыедуць трупы з Арменіі, Казахстана, Малдовы, Таджыкістана, Расіі, Грузіі і, вядома, беларускія тэатры. У праграму фестывалю ўключаны 22 спектаклі ад 22 тэатральных калектываў. Паказ спектакляў адбудзецца на трох мовах: беларускай, рускай і таджыцкай у суправаджэнні сінхроннага перакладу на рускую мову. Пастаноўкі пройдуць на 3 пляцоўках горада: у вялікай і малой залах Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы, у Палацы культуры прафсаюзаў і Брэсцкім тэатры лялек. У фестывальнай афішы 2021 года будуць прадстаўлены таксама пластычныя, балетныя і музычныя пастаноўкі.

***— "Паўночныя Афіны" — сядзіба Міхала Клеафаса Агінскага пад Смаргонню з 2014 года адчынена для турыстаў. Зараз там плануюць аднавіць і стайню, дзе будуць змяшчацца коні і прылады для паездак, а таксама музей. Як праходзіць рэстаўрацыя?***

**Аксана Каханава, галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама:**

— З 2018 года ў сядзібу былі закуплены пара коней, дзве поні, карэта і сані з мэтай катаць турыстаў. Неўзабаве было задумана адрэстаўраваць стайню, на якую па праектна-каштарысная дакументацыі ў 2020 годзе было патрэбна 670 тыс. рублёў. Па спонсарскай дапамозе ад "Банка развіцця" на стайню мы атрымалі 300 тыс. рублёў, і па ўказу Прэзідэнта краіны па падтрымцы аб'ектаў культуры - яшчэ 230 тысяч рублёў. У выніку 140 тысяч рублёў не хапае на давядзенне плануў у рэальнасць. Але мы будзем асвойваць тыя грошы, якія ўжо ёсць, перш за ўсё на вонкавыя работы. Гэта ўмацаванне сцен, падмурка, замена даха. Астатнія грошы, па даручэнні міністра культуры Анатолія Маркевіча, будзем браць з абласных і раённых сродкаў.

***— Цалкам зразумела, што людзі з абмежаванымі магчымасцямі маюць права наведваць установы культуры. А ў якой ступені развіта безбар'ернае асяроддзе на гэтых аб'ектах у нашай краіне?***

**Уладзімір Патапенка, старшыня цэнтральнага ўпраўлення Беларускага таварыства інвалідаў:**

— Няма чаго і казаць, безбар'ерны асяродак для людзей з абмежаванымі магчымасцямі вельмі патрэбны. Не так даўно браліся за тое, каб у кінатэатрах зрабіць месцы для калясачнікаў, але пакуль справа не дужа рухаецца наперад. Хіба што ў Вялікім тэатры адвялі месцы для інвалідаў. Але, з іншага боку, чалавек сам павінен вырашаць, на якім месцы яму сядзець ва ўстанове культуры. Менавіта даступнасць агульначалавечых дабротаў, у тым ліку культурных, і з'яўляецца адзнакай здаровай грамадзянскай супольнасці. Пры тым, што многія інваліды працуюць і плацяць падаткі.

**Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ**

КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Галоўны рэдактар** — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **адказны сакратар** — Таццяна ПАШЭНЬКА; **рэдактар аддзела:**
Йўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныкарэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
**Першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашартрныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.**
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2021. Наклад 2930. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 16.07.2021 у 19.30. Замова 1789.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

# Пад знакам Года народнага адзінства

**13 ліпеня адбылася чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства. З дапамогай сродкаў відэасувязі, удзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.**

Павел САЛАЎЁЎ

У пачатку нарады Анатолій Маркевіч падзякаваў Магілёўскаму аблвыканкаму за годнае правядзенне ўрачыстасці "Александрыя збірае сяброў", а таксама абмеркаваў пэўны шэраг пытанняў адносна свята "Славянскі базар".

Асаблівая ўвага была нададзена візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі ў Вялікі тэатр оперы і балета на Дзень Незалежнасці. Кіраўнік краіны прапанаваў кожны год 3 ліпеня ўшаноўваць яшчэ і лепшых супрацоўнікаў культуры на гэтым свяце,

Пасля міністру далажылі пра стратэгію развіцця Нацыянальнага мастацкага музея. Дырэктар установы Уладзімір Пракапцоў адзначыў, што 17 верасня, у гадавіну ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, у музеі плануецца адкрыць выставу, на якой будзе прадстаўлена сакральнае царкоўнае мастацтва, сучаснае беларускае і рускае мастацтва, заходняе мастацтва і многа іншага.

Тэма ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі ўздымалася і ў сувязі з музеефікацыяй комплекса будынкаў у Бярозе, дзе ў міжваенны час знаходзіўся польскі канцэнтрацыйны лагер.

У Коапыль, дзе будзе святкавацца Дзень пісьменства, у хуткім часе адправіцца камісія Міністэрства культуры з мэтай праверыць падрыхтоўку горада да традыцыйнай ужо падзеі. З даклада міністру вынікала, што Коапыль да свята ў цэлым добра падрыхтаваны.

Ізноў уздымалася праблема рэканструкцыі палацава-паркавага комплекса ў Свяцку і Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску. Міністр пацікавіўся і рэстаўрацыяй стайні ў сядзібе Агінскіх, і выказаў шэраг заўваг і прапаноў.

Акрамя таго Анатолій Маркевіч па выніках прыёма грамадзян ў Магілёве зрабіў выснову, што не ўсім спецыялістам былога філіяла Акадэміі музыкі пасля аптымізацыі ўстановы зрабілі прапановы на новае месца працы, і ўзяў гэта пытанне пад асабісты кантроль.

К

**8 ліпеня 2021 года ў Музеі-сядзібе М.К. Агінскага, што ў аграгарадку Залессе Гродзенскай вобласці, адбыўся выязны семінар па пытаннях рэалізацыі кадравай палітыкі ў сферы культуры і ўдасканалення работы з рэзервам кіруючых кадраў. Арганізатарам семінара выступіла Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Працай яго кіраваў намеснік міністра культуры Валерый Грамада. У семінары бралі ўдзел кіраўнікі кадравай і юрыдычнай службаў Міністэрства, кіраўнікі падпарадкаваных Міністэрству культуры ўстаноў, упраўленняў культуры і кадравых службаў аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама.**

Сядзіба М.К.Агінскага ў вёсцы Залессе.

# Семінар па кадрах у гістарычнай сядзібе

Зміцер ЮРКЕВІЧ

Перад тым як у Залессі распачалася праца семінара, яго ўдзельнікі пабывалі ў Смаргоні, дзе іх віталі хлебам-соллю супрацоўнікі гарадскога Дома культуры. Дарэчы, тут жа госці наведалі і бібліятэку, а крыху пазней у актавай зале ДК выступіла начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама Таццяна Ражэва, якая засяродзіла ўвагу прысутных на кадравых пытаннях у сферы культуры свайго раёна.

У хуткім часе адбыўся і сам семінар у Залессі. З вітальным словам да ўдзельнікаў і гасцей семінара звярнуўся намеснік старшыні Смаргонскага райвыканкама Ігар Шчасны, які распавёў пра культурнае жыццё Смаргоншчыны і дзейнасць Музея-сядзібы М. К. Агінскага.

Намеснік міністра культуры Валерый Грамада засяродзіў свой выступ на задачах семінара і акрэсліў межы праблемнага поля. "Мэта нашага мерапрыемства - ацаніць кадравы патэнцыял краіны, які маецца на сённяшні дзень, абмеркаваць праблемныя пытанні і, па-магчымасці, вызначыцца са шляхам іх вырашэння", — зазначыў ён.

З пераканаўчым акцэнтным дакладам выступіла начальнік аддзела кадравай работы і дзяржаўных узнагарод Міністэрства культуры краіны Аксана Лісенкова. У сваёй прамове яна прафесійна прааналізавала праблемы і поспехі, якія існуюць у кадравай галіне сферы культуры, вызначыла яе патэнцыял, акрэсліла асноўныя накірункі кадравай палітыкі і арганізацыю працы з рэзервам кіруючых кадраў на бліжэйшую перспектыву.

У прыватнасці, прамоўца адзначыла, што пытанням рэалізацыі кадравай палітыкі ў нашай дзяржаве надаецца асаблівая ўвага. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка неаднаразова ўказваў на неабходнасць удасканалення і паляпшэння работы ў гэтым напрамку на ўсіх узроўнях. Абсалютна відавочна, што пазіцыі дзяржавы ў сучасным свеце вызначаюць не толькі вытворчыя магутнасці, прыродныя рэсурсы, але і людзі.

"Кажучы аб кадрах, мы гаворым пра тых людзей, якія сваёй працай забяспечваюць развіццё дзяржавы, грамадства, эканомікі, уключаючы сацыяльную сферу, да якой адносіцца і сфера культуры, — падкрэсліла Аксана Лісенкова. — А сёння беларускаму грамадству як ніколі патрабуецца згуртаванасць і яднанне, таму толькі ідэалагічна абумоўленая кадравая палітыка можа адпавядаць нацыянальным інтарэсам...

Сучаснае дзяржаўнае будаўніцтва прад'яўляе да асоб, якія прыходзяць на дзяржаўную службу, на кіруючыя пасады ў дзяржаўныя арганізацыі, высокія патрабаванні, бо менавіта ім трэба будзе дакладна разумець, якой арганізацыйны клімат яны збіраюцца культываваць ва ўстановах культуры і якія дакладныя кіраўнічыя рашэнні прымаць.

Так, службовыя асобы на ўсіх узроўнях павінны быць арыентаваны на праяву ініцыятывы пры прыняцці рашэнняў, але з адначасовым узмацненнем персанальнай адказнасці за канчатковы вынік. Дзяржаўныя рэсурсы, затрачаныя на падтрымку ўстаноў культуры павінны карэлявацца з той ідэалагічнай і творчай аддачай, якую атрымлівае ад іх грамадства".

Начальнік юрыдычнага аддзела Міністэрства Віталій Бейлін распавёў пра апошнія змены ў Працоўным кодэксе Рэспублікі Беларусь, а таксама пра нарматыўную прававую базу, што рэгламентуе працу з рэзервам кіруючых кадраў.

Начальнік аддзела ўстаноў адукацыі Міністэрства культуры Марына Юркевіч выказала думку, што ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі павінна праводзіцца дакладная прафарыентацыйная работа, каб у выніку дыплом атрымліваў высокакваліфікаваны спецыяліст, які будзе любіць сваю прафесію і гатовы застацца ў сферы культуры.

Даволі эмацыйным атрымаўся выступ рэктара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Кацярыны Дулавай, які яна прысвяціла пытанням падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй у сферы культуры і мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Выступленне спадарыні Дулавай было падтрымана рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва Наталляй Карчэўскай. Пытанні адносна падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў музычных калектываў узніміліся вельмі цікавыя, грунтоўныя, з гэтай прычыны шкада, што семінар не трансляваўся on-line, а запіс не вёўся.

Тым не менш, бадай што агульным пасылам усіх выступаў было прызнанне наяўнасці пэўнай праблемы з кадравым патэнцыялам, сыход маладых спецыялістаў пасля адпрацоўкі, прызыў у войска, пасля якога губляюцца назапашаныя веды і навыкі, невысокі заробак, пераразмеркаванне, перакваліфікацыя, вострая праблема з жытлом, якая ставіць спецыялістаў не ў самыя лепшыя ўмовы.

Падводзячы вынікі семінара, намеснік міністра культуры Валерый Грамада падкрэсліў, што больш грунтоўна акрэсленыя праблемы будуць разгледжаны пазней — на наступным мерапрыемстве, якое мусіць адбыцца ў жніўні, перад пачаткам новага вучэбнага года. Да гэтага часу трэба ўзгадніць прапановы і выпрацаваць шляхі рашэння абмеркаваных праблем.

Пасля афіцыйнай часткі для гасцей сядзібы адбылася экскурсія па музеі. Можна было абыйсці тэрыторыю сядзібнага комплекса, азнаёміцца з тым, якія змены тут адбыліся за апошнія гады і месяцы. Бо Музей-сядзіба М.К. Агінскага працягвае ўмацоўвацца: адносна нядаўна тут распачалася праца па аднаўленні стайні.

У бліжэйшых нумарах "К" мы плануем распавесці пра мінуўшчыну, сённяшні дзень і будучыню музея-сядзібы ў Залессі больш падрабязна. Ну, і вядома, пра вынікі семінара мы яшчэ таксама пагаворым.

К

# Музычныя кветкі ліпеня

**Заўсёдная "візітоўка" Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" — урачысты гала-канцэрт адкрыцця. Усе жадаючыя маглі ўбачыць яго тэлетрансляцыю позна ўвечары ў чацвер. Але ж цікава і тое, як ён рыхтаваўся. Тым больш, што сёлетні фэст — юбілейны, 30-ты па ліку.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Вядома, юбілей фестывалю не мог не адбіцца на канцэпцыі, — расказаў напярэдадні рэжысёр гала-канцэрта адкрыцця Аляксандр Вавілаў. — Мы згадваем не толькі найбольш значныя фестывальныя старонкі, але і тых яго ўдзельнікаў, хто сышоў ад нас за гэты час: Валянціна Гафта, Людмілу Гурчанка, іншых знакамітых дзеячаў культуры, якія заўсёды высока ацэньвалі фестываль такога ўзроўню і маштабаў. Вельмі прыемна, што нягледзячы на складаныя эпідэміялагічныя абставіны, ніхто з тых, каго мы запрашалі, не адмовіўся. Але, на жаль, днямі захварэў на кавід адзін з удзельнікаў гурта Dabro, і гэты дуэт братоў Засідкевічаў з Казані, што імгненна набыў папулярнасць, мы ў Віцебску сёлета не ўбачым. Як ніколі багата будзе прадстаўлена творчая моладзь — і айчынная, і з іншых краін. Увогуле, гала-канцэрт адкрыцця — гэта заўжды яшчэ і адкрыццё ў шырокім сэнсе слова. Бо гледачы, што сабраліся ў Летнім амфітэатры і ля тэлеэкранаў, уся культурная грамадскасць адкрываюць для сябе падрыхтаваныя арганізатарамі і артыстамі спецыяльныя канцэртныя нумары, сюрпрызы, падарункі.

Дададзім, што адным з герояў сёлетняга фестывалю стане былы пераможца Міжнароднага конкурсу эстрадных выканаўцаў на "Славянскім базары ў Віцебску", сусветна знакаміты спявак з Казахстана Дзімаш Кудайберген. Можна толькі ганарыцца тым, якіх зорак адкрывае свету наш фестываль. І не проста адкрывае, а працягвае з імі супрацоўнічаць і надалей: сёлета Дзімаш Кудайберген прадстаўлены не толькі ў фестывальных праграмах і, у прыватнасці, у канцэрце адкрыцця, але і ўваходзіць у склад конкурснага журы, тым самым забяспечваючы пераемнасць традыцый.

— "Славянскі базар у Віцебску", — працягвае нашу размову Аляксандр Дзмітрыевіч, — збірае не проста "Усе кветкі ліпеня", як спяваецца ў вядомай песні Леаніда Захлеўнага на словы Алега Жукава, што стала адным з сімвалаў фестывалю, а менавіта лепшыя музычныя кветкі Беларусі і ўсяго свету.

Урачысты гала-канцэрт адкрыцця.

Дзімаш Кудайберген.

# Бас — усяму галава

**Адным з першых мерапрыемстваў юбілейнага XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" стала адкрыццё памятнай мемарыяльнай дошкі аднаму з заснавальнікаў гэтага буйнога форуму і яго першаму дырэктару Радзівону Басу.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

Над стварэннем дошкі, што цяпер упрыгожвае будынак Цэнтра культуры "Віцебск", дзе Радзівон Бас быў генеральным дырэктарам, працаваў віцебскі скульптар Сяргей Сотнікаў. Барэльефная выява Радзівона Міхайлавіча знітавана з лагатыпам фестывалю, бо ў нашым усведамленні яны і сапраўды адно непадзельнае цэлае: гаворым "Славянскі базар" — маем на ўвазе Радзівона Баса, вымаўляем імя Баса — маем на ўвазе знакаміты фестываль, узрошчаны ім як арганізатарам, прадзюсерам і рэжысёрам да цяперашніх маштабаў і сусветнага прэстыжу.

На барэльефе змешчана не ўся постаць Баса, а толькі ягоная галава — гэткі партрэт буйным планам. Але ў тым бачыцца і своеасаблівая сімволіка: гэты заслужаны дзеяч культуры Беларусі, ганаровы грамадзянін Віцебска, быў сапраўды "галавой-главой" не толькі гэтага фестывальнага праекта, але і, шырэй, усяго таго актыўнага, разгалінаванага фестывальнага руху, што мы маем сёння ў краіне. Місія Баса (яшчэ і ў адпаведнасці з прозвішчам) як асновы, моцнага "фундаменту" музычнага збудавання, як стваральніка і аб'яднальніка выявілася ўжо на самых першых фестывалях. Памятаю, як па завяршэнні Другога форуму 1993 года я амаль засынала, а ён, нястомны, дзяліўся планамі на будучыню. На той час яны здаваліся (па меншай меры, асабіста мне) немагчымымі, нязбыўнымі. Але ж усё адбылося! Дый колькі адбылося звыш таго!

"Славянскі базар", што ўзрос на руінах Усесаюзнага фестывалю польскай песні, спярша мацаваўся, здавалася б, вакол спеўнага конкурсу. Але імгненна ў якасці "дадатковых мерапрыемстваў" далучыліся тыя фестывальна-конкурсныя праекты, якімі Радзівон Бас займаўся раней, у 1980-я — пачатку 1990-х: тут быў і джаз (узгадаем джазавую "Віцебскую восень" 1981 — 1989-га, Міжнародны "Парад дыксілендаў" 1983 — 1993 гадоў), і конкурсы прыгажосці ("Віцебская прыгажуня" 1989 года), і проста клопат пра журналістаў, якім патрэбны і стасункі з зоркамі, прычым не толькі на прэс-канферэнцыях, але і ў нефармальнай абстаноўцы, і проста адпачынак (як тут не згадаць круізы на кацеры, дзе гэта было "два ў адным").

Спачатку фестываль узрастаў ушыр, потым пачаў расці "ўглыб". Адной з найбольш яркіх кульмінацый гэтага працэсу асабіста для мяне стаўся тэатралізаваны аповед пра Марка Шагала — па цяперашніх мерках, найсучасны site-specific спектакль, а па тых часах — штосьці неверагоднае. Усё адбывалася не проста на вуліцы, між будынкамі Цэнтра культуры і ратушы, а ў прасторы: фігуры мастака, Бэлы, яўрэйскіх музыкантаў з'яўляліся ў адчыненых вокнах, луналі ў паветры. Было адчуванне, што ты знаходзішся дзесьці "ўнутры" шагалаўскіх карцін.

Дык, можа, Бас, пры ўсіх яго здольнасцях спалучэння мастацтва з грашовым складнікам, і быў такім шагалаўскім героем, што лётаў над горадам, над фестывалем і бачыў больш, чым усе астатнія? Толькі чаму — "лётаў"? Яго матэрыялізаваныя думкі жывуць на фестывалі і дагэтуль — і, трэба спадзявацца, будуць плённа развівацца і надалей.

Адкрыццё памятнай дошкі Радзівону Басу.

# Памятаць пра лепшае

**Народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка — заўсёднік "Славянскага базару ў Віцебску": без яго ўдзелу, здаецца, не праходзіў ніводны фестываль. А сёлета знакаміты кіраўнік "Сяброў" яшчэ і старшыня журы XXX Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск-2021". Таму "К" і звярнулася да яго за парадай маладым спевакам.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Хочацца пажадаць канкурсантам, — даў свой "старшынскі наказ" Анатоль Іванавіч, — каб яны змаглі сканцэнтравацца і не "мандражавалі" на сваіх выступленнях. Бо як часцяком здараецца? Рыхтуецца чалавек, рэпетуе ў класе, на сцэне — усё цудоўна. А выходзіць спяваць уласна ў час конкурсу — і ўсё, перажыванні не даюць яму магчымасці выкласці як мае быць тое, што назапашана. Дый на такім прыстыжным спаборніцтве, як "Славянскі базар у Віцебску", дадаецца яшчэ груз адказнасці не толькі за сябе і сваіх выкладчыкаў, а за ўсю краіну, якую прадстаўляеш. Між тым, любы конкурс патрабуе найперш праславутых "змагарскіх якасцей", умення засяродзіцца на песні і яе выкананні, а не на сваіх пачуццях і перажываннях з-за конкурснай барацьбы. Журы ацэньвае не адоранасць чалавека ўвогуле, а менавіта тое, што чуе і бачыць "сёння і зараз". І надае вялікую ўвагу артыстызму — тым больш, што гэта конкурс не проста вакалістаў, а выканаўцаў эстраднай песні, дзе ўсё павінна быць у комплексе: тэмбр голасу, прафесійныя якасці, рэпертуар, знешні выгляд, сцэнічныя паводзіны.

Але ж да "Славянскага базару ў Віцебску" рыхтуюцца не адно канкурсанты. Кожны эстрадны артыст задумваецца, якую прэм'еру ён зможа паказаць, многія песні пішуцца акурат да гэтага "фестывалю фестываляў". Будуць прэм'еры і ў мяне — найперш, "Ты памятаеш" пра чалавечыя каштоўнасці, пра тое, што зразумела і блізка ўсім людзям, незалежна ад іх прафесійнага, сацыяльнага статусу ці нацыянальнай прыналежнасці. Гэта песня з'явілася ў маім рэпертуары па ініцыятыве нашага вядомага кампазітара Алега Елісеенкава. Ён прапанаваў мне вершы расійскай паэткі Віталіі Раменскай з Таганрога, я імі зацікавіўся — і ён напісаў музыку. Удзельнічаю я і ў іншых фестывальных праграмах. Але ж галоўнае не ўва мне, а ў самім фестывалі: "Славянскі базар у Віцебску" збірае ўсё лепшае ў культуры, што ёсць не толькі ў нас, але і ў Еўропе, у свеце. Ён будзе заўсёды.

Анатоль Ярмоленка.

**Удзел у "Славянскім базары ў Віцебску" Прэзідэнцкага аркестра Беларусі — даўно не навіна, а трывалая традыцыя. Але яшчэ ніколі гэты калектыў не быў прадстаўлены на фестывалі так разнастайна: не толькі ў канцэртных праграмах, але і ў тэатральным спектаклі.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

# Аркестр у Амфітэатры — і ў тэатры

17-га ўвечары малы склад Прэзідэнцкага аркестра на чале з дырыжорам Віталем Кульбаковым іграе на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа — суправаджае спектакль "Тры сястры" паводле М.Чэхава Незалежнага тэатральнага праекта "ТриТформаТ". 18-га а 18-й гадзіне праводзіць у Амфітэатры гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі і застаецца на гэтай сцэне да глыбокай ночы: пасля невялічкай рэпетыцыі тут адбываецца заключны гала-канцэрт фестывалю, сумешчаны з другім конкурсным днём — выкананнем эстраднай песні кампазітара славянскай краіны на адной са славянскіх моў у суправаджэнні аркестра.

— У нас ва ўсіх сэнсах слова "спякотнае лета", — усміхаецца галоўны дырыжор калектыву Віталь Кульбакоў. — Па два-тры мерапрыемствы на дзень. Да конкурсу мы пачалі рыхтавацца тры месяцы таму. Атрымалі ад канкурсантаў абраныя імі песні, зрабілі аркестроўкі, запісалі іх — і месяц таму выслалі ўдзельнікам, каб тыя прывыкалі да аркестравага гучання свайго рэпертуару. 14 і 15 ліпеня — дзве рэпетыцыі з канкурсантамі ў Мінску. Першае вочнае знаёмства з імі я пачаў са слоў: "Вы знаходзіцеся ў самай сяброўскай краіне, дзе кожны з нашых музыкантаў будзе вам дапамагаць, каб вашае выступленне было як мага лепшым". Мы сапраўды імкнемся "прыкрыць" удзельнікаў: закцэнтаваць гучаннем аркестра іх найбольш яркія рысы і, наадварот, "змякшываць" магчымыя недахопы, ператварыць іх у гэткую індывідуальную асаблівасць.

Гаварыць пра конкурсны ўзровень на аснове адных толькі рэпетыцый даволі складана. Здараецца, некаторыя ўдзельнікі спяваюць не ў поўную моц, зберагаюць, размяркоўваюць сілы. Хтосьці — наадварот, за час падрыхтоўкі "перагарае", стамляецца і прыходзіць да фіналу ніякаватым. А хтосьці і ўвогуле імкнецца перахітрыць астатніх: папярэдне паказвае быццам бы сярэдні ўзровень, а на выступленні выдае такую дасканалую тэхніку, што ўсе, па кантрасце, уражаны ўтрая.

Конкурсныя выступленні на заключным канцэрце будуць паказвацца "блокамі": пасля кожнай чацвёркі ўдзельнікаў выступаюць госці. Такое чаргаванне, прапанаванае рэжысёрам Марынай Раманоўскай, дапаможа журы і публіцы не толькі крыху адпачыць, але і супаставіць маладых выканаўцаў з прызнанымі артыстамі. Дарэчы, тыя ж Сяргей Пенкін, Мікалай Наскоў і іншыя зоркі будуць спяваць з нашым аркестрам "жыўцом".

Не менш цікавым абяцае быць гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі "Крок by крок". І не толькі з пункту гледжання рэжысёрскай канцэпцыі і сцэнарыя, але і праз уласна музычнае напаўненне. Бо гэта найперш цудоўныя артысты, сярод якіх ёсць і знаныя (Ірына Дарафеева, Аляксандр Саладуха, Вікторыя Алешка, Алёна Ланская, "Песняры", "Сябры", "Верасы", "Аўра", "Чараўніцы"), і зусім маладыя (Вольга Булай, Антон Карчэўскі, Кірыл Кучынскі, які скончыў усяго толькі першы курс Акадэміі музыкі). Сярод "фішак" канцэрта — выступленне балалаечніка-віртуоза Аляксандра Варанішчы, колішняга выпускніка Лідскага музычнага каледжа і Гродзенскага ўніверсітэта. А галоўнае, у праграме многа не толькі вядомых кампазіцый, але і песенных прэм'ер, напісаных Валерыем Шматам, Яўгенам Алейнікам і іншымі аўтарамі.

Што ж да "Трох сёстраў", дык гэты спектакль па просьбе Веры Паляковай ставіла маладая расійская рэжысёр Таццяна Самбук. Музыка спачатку планавалася ў запісу, але потым было вырашана пакінуць яе жывое выкананне, і мы неаднаразова выступалі на Малой сцэне Палаца Рэспублікі. Потым была "Княжна Мэры" паводле М.Лермантава, пастаўленая тым жа рэжысёрам, але ўжо на вялікай сцэне таго ж Палаца Рэспублікі. Дарэчы, днямі, а менавіта 10 ліпеня гэты спектакль ішоў на пляцоўцы ля мінскай Ратушы — на адкрытым паветры. Мы былі ўпэўнены, што на такім вулічным паказе публіка будзе падыходзіць, сыходзіць, пераходзіць з месца на месца. Ажно не: сабралася каля паўтары тысячы чалавек — і ўсе глядзелі спектакль да канца. Прычым у цішы, бы ў тэатральнай зале. Асабліва відавочна гэта стала ў сцэне дуэлі Пячорына з Грушніцкім, калі раздаўся стрэл, а за ім — ледзь не паўхвіліны поўнай цішыні. Трэці спектакль з удзелам музыкантаў аркестра і ў пастаноўцы ўсё той жа Таццяны Самбук мы рыхтавалі да Міжнароднага дня абароны дзяцей: казку "Не Вожык" паводле аднайменнай п'есы Ганны Багачовай паказвалі не толькі на стацыянары, але і па школах-інтэрнатах, піянерскіх лагерах. Музыкантам і мне як дырыжору давялося тут папацець: па задуме рэжысёра, інструменталісты не толькі іграл музыку Сяргея Сухамліна, але і, апрануўшы "шапкі з вушамі", выступалі ў ролі зайцоў. А я станавіўся ваўком і, адпаведна, ганяў іх па сцэне.

Тэатралізаваную лінію аркестр будзе працягваць. На 5 лістапада запланаваны "Пер Гюнт" з музыкай Грыга, але ў сучасных апрацоўках: джаз, соул, рок. Прычым нумары знакамітай сюіты, складзенай з музыкі да п'есы Ібсена, будуць суправаджацца рознымі відамі мастацтваў: тут і пескаграфія, і балет. У перспектыве падобным чынам хацелася б выканаць "Карцінкі з выстаўкі" Мусаргскага — таксама ў сучасным рознастылёвым гучанні і тэатралізаваным асяроддзі.

Але ж пасля "Славянскага базару ў Віцебску" — адразу ў адпачынак. А ў верасні на конкурснай аснове дабяром у аркестр групу выканаўцаў на драўляных духавых інструментах. Калісьці яна была, потым яе скарацілі. Але практыка паказала неабходнасць яе аднаўлення, каб аркестр меў поўны сімфанічны склад і больш магчымасцей для выканання самай рознай музычнай стылістыкі і твораў розных эпох.

# Лялькі "квартальныя" і запамінальныя

**У сёмы раз на "Славянскім базары ў Віцебску", пачынаючы з 2014 года, ладзіцца праект "Лялечны квартал". Ён збірае не толькі дзіцячыя, але і сур'ёзныя дарослыя спектаклі тэатраў лялек з розных краін, застаючыся адным з самых інтэлектуальных асяродкаў летняга фестывалю, і дадаткова дэманструе сінтэз мастацтваў, заяўлены як адна з эстэтычных платформ гэтага буйнога форуму.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Сёлета да нас прыехалі тыя тэатры і спектаклі, якія мы запрашалі летась, — распавёў Віктар Клімчук, мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра "Лялька", на базе якога і ладзіцца праект. — Мінулым разам з-за пандэміі ўсе фестывальныя мерапрыемствы ў зачыненых памяшканнях былі скасаваны, і мы перанеслі нашы запрашэнні на 2021 год. Я вельмі рады, што тэатры падтрымалі гэтае рашэнне і не адмовіліся завітаць да нас сёлета. На жаль, не змог прыехаць тэатр "Церамок" з Волагды са сваёй версіяй "Кармэн". Захварэлі на каранавірус артысты тэатра "Агніва" з Мыцішчаў, якія павінны былі паказаць надзвычай кранальны спектакль "Оскар і Ружовая дама" пра апошнія дні смяротна хворага хлопчыка. Таму ў апошні момант мы замянілі гэтае найменне на свой спектакль. Дзякуючы добрым стасункам Віцебска з расійскім Псковам, сувязям паміж гарадамі на ўзроўні мэрый, у афішу дадаўся дзіцячы спектакль "Прыгучае мышаня" Пскоўскага абласнога тэатра лялек.

У выніку ў праекце сёлета ўдзельнічаюць пяць расійскіх тэатраў — і наш. Праграма заўсёды фарміруецца вельмі дбайна і рупліва. Я не ўключаю ў яе тыя спектаклі, пра якія ад кагосьці чуў, але сам іх не бачыў. Гэта дапамагае пазбегнуць магчымых памылак, бо справа ж не толькі ў мастацкай якасці пастановак, але і ў тым, наколькі прыцягнуць яны спрактыкаваную віцебскую публіку і будуць адэкватна ёй прачытаны. Плён такога падыходу відавочны: квіткі на спектаклі "Лялечнага квартала" разлятаюцца імгненна. Сёлета, да прыкладу, на камедыю "Паважаныя грамадзяне!" паводле аповедаў Міхаіла Зошчанкі, якую прывозіць тэатр "П'еро" з Арэнбурга, квіткі зніклі літаральна ў першы дзень продажу.

Да згаданых спектакляў дадам яшчэ "Усе мышы любяць сыр" з Масквы, "Брыдкае качаня" тэатра "Бадзяжны сабака" з Санкт-Пецярбурга, гісторыю злачынства "Забіць

Сцэна са спектакля "насарог і Жырафа".

Памятныя сувеніры ўдзельнікам.

Фота Вячаслава ШАЙНУРАВА.

Атмасфера перад пачаткам спектакляў у фае тэатра...

...і перад уваходам.

Караля” паводле Мрожэка Пензенскага абласнога тэатра “Лялечны дом”. Пры такім замежным узроўні (а некалькі тэатраў уганараваныя Расійскай нацыянальнай тэатральнай прэміяй “Залатая маска”) яшчэ больш прыдзірлівым становіцца адбор уласных спектакляў.

Наш тэатр прадстаўлены на сёлетнім фестывалі трыма працамі. Гэта “Лялькі Ціма Талера, ці Прададзены смех” — вельмі стыльны, атмасферны спектакль нашага мастака-канструктара Дзмітрыя Гаралевіча, якім мы завяршаем VII “Лялечны квартал”. “Мой вялікі маленькі дзядуля” прасякнуты настальгіяй, тонка пададзенай тэмай не бацькоў і дзяцей, а дзядоў і ўнукаў. П’есу напісала наша мясцовая аўтарка Вольга Прусак. Там распавядаецца пра дзяўчынку, не адаптаваную да соцыуму. Яе разумее толькі дзядуля — яе адзіны блізкі сябра: яна нават у школу з ім ходзіць. Дзядуля занепакоены, што стане з унучкай, калі ён пакіне яе назаўжды, і дапамагае ёй пасябраваць з хлапчуком. Спектакль атрымаўся сентыментальным, крыху сумным, незвычайным. Нарэшце, “Насарог і Жырафа”, якім мы адкрылі “Лялечны квартал”, узнімае афрыканскую тэму, у ім многа песень і танцаў. Але праз жыццё экзатычных жывёл нязмушана распавядаецца, вядома, пра чалавечыя стасункі, каштоўнасць якіх мы яшчэ больш ацанілі ў час пандэміі.

Чалавечы фактар спрацоўвае і пры падрыхтоўцы нашага праекта. Шмат гадоў я ўдзельнічаў у працы журы фестываляў лялечных тэатраў, што праходзілі ў Сербіі, Расіі, ездзіў на іншыя міжнародныя форумы. Паглядзеў безліч спектакляў, выкананых у самых розных тэхніках і стылях, завязаў кантакты з многімі і многімі тэатральнымі калектывамі. Без гэтага “Лялечны квартал” наўрад ці станавіўся б такім яркім і запамінальным. Бо калектывы, уключаючы самыя знаныя, “залатамасачныя”, едуць да нас за свой кошт. Вядома, яны атрымліваюць ганарар за выступленні, але той не пакрывае іх выдаткі. Так, да прыкладу, сёлета не змог да нас прыехаць тэатр з Краснаярска: папросту не хапіла грошай на дарогу.

Увогуле, удзел у фестывалі на такіх умовах магчымы хіба праз сяброўства, асабістае знаёмства ды прыязныя стасункі з калектывамі і іх кіраўнікамі. А таксама праз высокі фестывальны імідж, бо для многіх тэатраў пабываць на “Славянскім базары ў Віцебску” — значыць, узняцца яшчэ на адну прыступку сваіх творчых дасягненняў.

# Пахваляцца? Ганарыцца!

**Сёння на “Славянскім базары ў Віцебску” (і ў прамым эфіры тэлебачання) — гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі “Крок by крок”. Як правільна “расшыфраваць” гэту назву і чаго чакаць ад самой вечарыны, мы даведаліся ў яе рэжысёра — мастацкага кіраўніка Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіславы Арцюкоўскай.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Назва, што спалучае беларускія часткі з англійскай, “перакладаецца як “Крок за крокам”. Але адначасова англамоўнае слоўца by стала прызнанай абрэвіятурай нашай краіны — Беларусі. Мы скарысталі гэтую гульню слоў і пабудавалі канцэрт на дэманстрацыі беларускіх брэндаў, уключыўшы ў яго не толькі культуру і мастацтва, але і, да прыкладу, спорт. Вядома, змясціць усё ў адведзеныя нам дзве гадзіны не проста цяжка — увогуле немагчыма. Але мы пастараліся цярпліва, спакойна, мэтанакіравана — менавіта “крок за крокам” — паказаць папраўдзе ўсё самае лепшае, што ў нас ёсць. І адначасова спалучыць музыку яшчэ і з жывапісам.

Натхняліся працамі беларускіх мастакоў XVIII — XX стагоддзяў, імкнуліся быццам “ажывіць” іх карціны. Да “Славянскага базару ў Віцебску” звычайна ладзяцца выставы сучасных мастакоў, дэманструюцца найноўшыя творчыя працы — XXI стагоддзя. Дый у Горадзе майстроў карцін хапае — на любыя густы. Мы ж вырашылі дапоўніць гэтую жывапісную лінію лепшымі прыкладамі беларускага выяўленчага мастацтва мінулага, каб стварыць больш поўнае ўяўленне пра нашу нацыянальную культуру.

Канцэрт умоўна падзяляецца на асобныя блокі, сярод якіх ёсць “Замкавая Беларусь”, “Маляўнічы край”, “Краса Беларусі”, нават “Прысмакі”. Але пра ўсё гэта мы распавядаем праз нашы песні. Да прыкладу, вядомая песня “Піце піва, мужыкі!” Мікалая Сацуры на словы Валянціны Аколавай у выкананні ансамбля “Сябры” — гэта яшчэ і згадка такога знакамітага беларускага брэнда, як піва, што для аматараў гэтага напою — сапраўдная смаката.

Іншымі словамі, мы імкнуліся сабраць разам усё, чым мы можам ганарыцца. А ганарыцца нам і сапраўды ёсць чым! Беларусы звычайна надта сціплыя, не любяць пахваляцца. Але выхваляцца і ганарыцца — розныя рэчы. І мы закцэнтавалі гэтую розніцу, выявіўшы тое, што можа лічыцца гонарам нашай краіны.

Уладзіслава Арцюкоўская.

# Купалле, “Славянскі базар…” і далейшыя перспектывы

**Заслужаная артыстка Беларусі, дацэнт кафедры мастацтва эстрады БДУКМ Ірына Дарафеева сёлета прадстаўляе нашу краіну ў журы дзіцячага конкурсу, а таксама ў некалькіх канцэртных праграмах фестывалю. Дый напярэдадні ў спявачкі было шмат значных музычных падзей.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Удзельнікам дзіцячага конкурсу, — гаворыць Ірына Аркадзеўна, — хачу пажадаць радасці і адчування на конкурсе свята жыцця. Бо перамога — гэта толькі адзін бок і не заўжды самы важны, хаця яна і дае магчымасць выйсці на вялікую сцэну Амфітэатра і выступіць на ёй. Конкурс “Славянскага базару ў Віцебску” стварае такую атмасферу, якая ўжо сама па сабе дорыць мора сіл, эмоцый, святочнага настрою, дае магчымасць завязаць новыя знаёмствы, а тое і сапраўднае сяброўства. Хочацца, каб дзеці на конкурсе не проста добра спявалі і выглядалі (а сцэнічны строй, яго стылістыка — неад’емныя часткі агульнага нумару), але і часцей усміхаліся, дасылаючы свой позітыў у глядзельную залу.

У разнастайных конкурсах я ўдзельнічала з 12-ці гадоў, але тады на “Славянскім базары ў Віцебску” яшчэ не было такога дзіцячага спаборніцтва. І тое, што гэты конкурс з’явіўся, — сапраўдная падзея ў культурным жыцці краіны і свету. Бо ён дае юным талентам добры прафесійны старт. Ні для кога не сакрэт, што тут нараджаюцца сапраўдныя эстрадныя зорачкі, бо па сваім узроўні дзіцячыя спаборніцтвы не толькі ні ў чым не саступаюць дарослым, але і часам пераўзыходзяць іх. Высокі ўзровень падрыхтоўкі можна назіраць і на адборачных турах, і на ранейшых дзіцячых конкурсах. Дарэчы, мне пашчасціла быць старшынёй журы ў 2014 годзе, калі першую прэмію атрымала Зінаіда Купрыяновіч, якую мы сёння ведаем пад псеўданімам Zena. Пазней яна прадстаўляла нашу краіну на “Еўрабачанні-2019” у Ізраілі, удзельнічала і перамагала ў іншых праектах, працягвае актыўна канцэртаваць. Шмат надзей мы ўскладаем і на сёлетняга канкурсанта — 13-гадовага Канстанціна Мазуркевіча. Разумееце, дзеці выхоўваюцца ў розных студыях і калектывах, удзельнічаюць у ансамблях. Не ва ўсіх ёсць багаты сольны вопыт, які патрабуецца для “Славянскага базару ў Віцебску”, таму адбор ідзе вельмі строгі. Сольны спявак павінен быць не толькі адораным, але і валодаць байцоўскімі якасцямі, неверагоднай харызмай, каб мы адчувалі яго талент, што называецца, “на адлегласці”. Чым далей, тым больш я разумею важнасць гэтых “дадатковых” якасцей, якія часцяком увогуле выходзяць на першы план. У гэтым пераконвае і мой вопыт выкладання, і мая ўласная канцэртная дзейнасць.

Літаральна напярэдадні адбыўся мой сольнік “Купалле ў Лідскім замку”, які, спадзяюся, перарасце ў штогодні фестываль, а далей і конкурс таксама. На правядзенне такога маштабнага праекту быў атрыманы грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, я вельмі ўдзячна за падтрымку Міністэрству культуры нашай краіны. Купальская тэматыка мяне аднаўляе, я нарадзілася на Купалле і штогод набіраюся сіл ад самой прыроды. Лідскі замак быў абраны невыпадкова: я выступала тут яшчэ тады, калі ён не быў адноўлены, адчувала энергетыку ад ягоных руін — і літаральна закахалася ў гэтыя мясціны. Вельмі рада, што гэтыя пачуцці аказаліся ўзаемнымі: нягледзячы на тое, што ў той жа дзень Купалле праходзіла ў Александрыі і многія паехалі туды, публікі было шмат, пасля канцэрта многія падыходзілі да мяне са словамі падзякі, узгадвалі мае ранейшыя прыезды: я ж аб’ездзіла з канцэртамі практычна ўсю Беларусь.

Але гэты сольнік быў асаблівым. Яго ідэю я выношвала яшчэ з мінулага года. Хацелася, каб публіка ўбачыла новае аднаўленне Ірыны Дарафеевай. І адначасова — з новага ракурсу зірнула на нашу нацыянальную спадчыну. Бо аўтарскія песні са свайго рэпертуару я імкнулася наблізіць да народных. Народныя ж песні — наадварот, падаць у такіх аранжыроўках, каб яны гучалі модна, сучасна, хітова. Над сцэнічнымі строямі працавалі два мадэльера-дызайнера: Настасся Фальковіч і Таццяна Сычова, якая, між іншым, прадстаўляе віцебскі брэнд “Рада”. Увогуле, каманда сабралася з розных куткоў краіны. І мы працавалі не толькі на гэты канкрэтны канцэрт, але і на перспектыву. Я прыцягнула да ўдзелу студэнтаў — былых і цяперашніх, дуэты Las Vegas, “PROвакацыя”, балетны калектыў БДУКМ пад кіраўніцтвам Рамана Кавалёва, а таксама школа танца “Атмасфера”: яны самі прапанавалі супрацоўніцтва, бо 24 верасня ў мяне будзе творчы вечару гэтым горадзе (а 9 кастрычніка, дадам, у сталічным Палацы Рэспублікі). Спецыяльную купальскую песню напісала для мяне Ганна Благава на словы Эльвіры Канцавой. Быў запрошаны музыкант Юрый Крывашэй, выпускнік кафедры духавой музыкі БДУКМ, які грае на жалейцы, дудках, дудзе. А лепшай дэкарацыяй стаў сам Лідскі замак, падсветлены неонавымі агнямі, бы сама папараць-кветка. Калісьці ў мяне быў сольнік у Мірскім замку, але тады ўсімі арганізацыйнымі пытаннямі займалася тэлебачанне. Цяпер жа ўся падрыхтоўка лягла на нашы ўласныя плечы, і я вельмі ўдзячна свайму новаму канцэртнаму дырэктару і рэжысёру гэтай вечарыны Яўгену Талкачову.

Што ж да “Славянскага базару ў Віцебску”, дык мой сёлетні ўдзел у ім не абмяжоўваецца “судзействам” у дзіцячым конкурсе. Да канцэрта адкрыцця па просьбе рэжысёра Аляксандра Вавілава быў зроблены дуэт з Дзмітрыем Даніленкам — “Не шкадуй” Андрэя Валава. Да гала-канцэрта “Крок by крок” майстроў мастацтваў Беларусі падрыхтавана песня “Вышыта сарочка” Сяргея Талкунова на словы Валянціны Паліканінай — з новай аранжыроўкай, новым дызайнерскім касцюмам. У канцэрце закрыцця прасПяваю яшчэ адну прэм’еру — “Я таю”, словы і музыка Юрыя Ермаленкава.

Увогуле, фестывалі — адна з галоўных аб’ядноўваючых сіл. Яны папраўдзе яднаюць і наш народ, і іншыя народы свету, робяць больш багатай як нацыянальную, так і сусветную культуру.

Ірына Дарафеева.

# Спаборнічаць? Весела!

**Акурат сёння а 15-й гадзіне на "Славянскім базары ў Віцебску" адкрываецца XIX Міжнародны дзіцячы конкурс "Віцебск-2021". Папярэдне, як заўжды, адбылося лёсаванне, дзеці паспелі пазнаёміцца. Сёння — першы дзень спаборніцтва, калі трэба праспяваць нацыянальны рэпертуар, а менавіта песню кампазітара краіны і на мове краіны, якую прадстаўляе той ці іншы ўдзельнік. Заўтра — другі конкурсны дзень з вольным рэпертуарам, а літаральна праз гадзіну пасля завяршэння праслухоўванняў — цырымонія ўзнагароджвання і гала-канцэрт.**

Надзея БУНЦЭВІЧ

Дзіцячы конкурс заўсёды адрозніваўся асаблівай казачнай атмасферай. Спрыялі гэтаму цікавыя рэжысёрскія рашэнні, імкненне зрабіць выступленні відовішчнымі, аднолькава цікавымі як для публікі, сярод якой заўжды многа дзятвы, так і саміх удзельнікаў. Некалькі гадоў запар плённа развівалася вельмі добрая ідэя натуральна ўпісваць конкурсныя песні ў падзеі нейкай вядомай ва ўсім свеце казкі, ад імя яе персанажаў даваць тэатралізаваныя падводкі да кожнага нумару, разыгрываць дыялогі між героямі. З цягам часу арганізатары вырашылі не эксплуатаваць вядомыя сюжэты, робячы на іх аснове своеасаблівыя сіквелы, а прыдумляць новыя. Так было ўжо летась, так будзе і сёлета.

— У музыцы, як вядома, сем нот, — тлумачыць сваю канцэпцыю рэжысёр Ірына Коўлена. — Колераў вясёлкі — таксама сем. Ці ж гэта выпадковае супадзенне? Канешне, не. Вось мы і вырашылі сачыніць на гэту тэму новую казачную гісторыю, якая магла б зацікавіць не проста дзяцей, а яшчэ і юных музыкантаў, маленькіх творчых асоб, у якіх добра развіта мастацкая фантазія.

Чаго-чаго, а фантазіі Ірыне Коўленай не займаць. Яна ж не проста займаецца тымі ці іншымі пастаноўкамі, а з'яўляецца галоўным рэжысёрам Цэнтра культуры "Віцебск", дагэтуль працавала там намеснікам генеральнага дырэктара па культурна-масавай рабоце. Ужо роўна дзесяцігоддзе, як яна ўзначальвае рэжысёрска-пастановачную службу Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу ў рамках "Славянскага базару ў Віцебску". На яе творчым рахунку не толькі рэжысура вялікай колькасці фестывальных мерапрыемстваў, але і шматлікія іншыя праекты. У тым ліку, не проста літаратурныя (у прыватнасці, тыя ж сцэнарыі), але і вершы. Невыпадкова яна была ўшанавана ганаровым тытулам "Чалавек года Віцебшчыны". Дый увогуле, менавіта родны горад і дзеці — дзве прыярытэтныя тэмы ў яе творчасці, якія часта сплятаюцца ў адну.

— Валошка стала адным з найбольш яркіх сімвалаў "Славянскага базару ў Віцебску", — працягвае Ірына Віктараўна. — Фестывальная эмблема таксама выканана ў выглядзе кветкі валошкі: да перагорнутай ноткі з хвосцікам-лісточкам прымаляваны валошкавыя пялёсткі. І на сёлетнім дзіцячым конкурсе будзе гэткае "Валошкавае дэфіле". Бо паводле нашай казачнай гісторыі, усе фарбы вясёлкі, сышоўшыся разам, даюць валошкавы колер. Дзіцячы конкурс на фестывалі — музычны, песенны. І кожны з конкурсных дзён адкрываецца асобнай песняй, не проста прымеркаванай да такога выпадку, але і звязанай з агульнай казачнай тэмай конкурсных праслухоўванняў — чароўнай вясёлкі. Так, першы дзень пачынаецца з песні "Вясёлкавае intro" Аркадзя Кірылава на мае словы, а другі — з аўтарскай песні Вікторыі Лабкоўскай "Вясёлка над Віцебскам".

Дададзім, што Аркадзь Кірылаў — таксама не проста музыкант і выкладчык. Ён мае самае непасрэднае дачыненне да Цэнтра культуры "Віцебск", узначальвае адзін з творчых калектываў гэтай установы — народны тэатр песні і музыкі "Мерхавім" ("Прасторы"). Яго выхаванцы неаднойчы станавіліся стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. А сам Аркадзь Навумавіч — аўтар не толькі шматлікіх песень, але і некалькіх музычных казак і мюзікляў. Што ні кажыце, таленавітыя людзі жывуць і працуюць у самым фестывальным беларускім горадзе — і, урэшце рэшт, робяць фестываль такім запамінальным.

# Вясёлкавыя песні

**Песню да другога дня дзіцячага конкурсу "Славянскага базару ў Віцебску" напісала Вікторыя Лабкоўская:**

— Я карэнная віцябчанка, вельмі люблю свой горад і саміх гараджан — часам крыху наіўных, але заўжды пазітыўных, гасцінных. Штогод удзельнічаю ў свяце горада, прысвячаю роднаму Віцебску свае песні. Сярод іх, да прыкладу, "Хвіліны шчасця", на якую быў зроблены кліп. Такіх песень-прысвячэнняў ужо пяць, бо мая любоў да горада шматгранная — як сем колераў вясёлкі. Тая ж тэма — сонечнай вясёлкі — сёлета абрана для дзіцячага конкурсу, таму ўсё сышлося: упершыню песня "Вясёлка над Віцебскам" прагучала на сцэне Амфітэатра ў час свята горада Віцебска ў канцы чэрвеня, а цяпер упрыгожыць конкурс у якасці яшчэ адной яго музычнай "эмблемы". Аранжыроўку зрабіў Аркадзь Кірылаў, з якім мы супрацоўнічалі і раней.

Мае песні вельмі шчырыя, яны ідуць ад сэрца. У свой час я скончыла Віцебскі музычны каледж імя Івана Салярцінскага, потым былі і сталічны Універсітэт культуры, і Педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Працавала ў Віцебскай філармоніі музыказнаўцам, а цяпер выкладаю фартэпіяна і музычную літаратуру ў дзіцячай школе мастацтваў аграгарадка Бабінічы. Імкнуся праз свае ўрокі, праз музыку Моцарта, Шапэна і іншых класікаў несці дзецям усё самае добрае, светлае, прамяністае. Неяк праспявала адной з вучаніц Ульяне Станько сваю песню "Детворяндия". І ёй, і іншым вучням спадабалася, пачалі спяваць яе самі. Дзецям хочацца не толькі на музычных інструментах граць, але і спяваць, а я іх заахвочваю, каб яшчэ і самі сачынялі — і мелодыі, і вершы. Праз такое самавыяўленне развіваюцца не толькі творчыя здольнасці: дзеці лепей спасцігаюць сябе саміх, разбіраюцца са сваімі думкамі і пачуццямі, знаходзяць для іх адэкватны выхад. Планую разам з рэжысёрам Ірынай Коўленай здзейсніць аўтарскі вечар, у якім будуць удзельнічаць дзеці. Гэта, можна сказаць, мая мара. У мяне і песня ёсць з такой назвай: маўляў, усе мары калі-небудзь збываюцца.

Чым далей, тым больш разумею, наколькі важнымі, часам лёсавызначальнымі бываюць выпадковыя сустрэчы. Трэба толькі ўважліва прыслухоўвацца да таго, што падкідвае табе жыццё. Так, у 2015 годзе я сустрэла Аркадзя Кірылава — і ўзнікла мая песня "Віцебская гісторыя" з шагалаўскай тэматыкай. Да таго ж, ён пазнаёміў мяне з Ірынай Коўленай. У 2018-м выпадкова сустрэлася з Тамарай Красновай-Гусачэнка — і паклала на музыку яе верш "Я иду по Витебску на зореньке". Гэту песню таксама рэжысіравала Коўлена.

Што ж да дзіцячага конкурсу "Славянскага базару ў Віцебску", дык да яго ў мяне стаўленне асаблівае. І не толькі таму, што выкладаю музыку і, такім чынам, павінна выказваць прафесійную цікавасць да падобных мерапрыемстваў. Наш фестываль — гэта свята. Мы без яго ўжо не ўяўляем сваё жыццё, імкнемся штогод да яго дакрануцца, наведаць той жа "Горад майстроў", яшчэ якую-небудзь фестывальную пляцоўку. А ўсё тое, што звязана з дзіцячай часткай фэсту: аблокі, вясёлка, мірнае неба, усмешкі дзяцей — гэта і ёсць тая прыгажосць, што выратуе сусвет.

## Фотафакт

Прадстаўнікі ўстаноў культуры г.Магілёва на "Славянскім базары".

# Дарога “Культуры” на “Славянскі...”

**Рэдакцыя нашай газеты праклала свой уласны, сапраўдны эксклюзіўны інфармацыйны шлях на знакаміты міжнародны форум. Кожны ліпень для журналістаў “К” быў на працягу гэтых трох дзесяцігоддзяў як самы напружана-няўрымслівы месяц, гарачы на эмоцыі ды, зразумела, на пошук таго самага эксклюзіва ў віры ўсімі чаканай падзеі. Але ж пачынаўся для нас фестывальны марафон як мінімум напрыканцы мая ці самым пачатку чэрвеня, калі ішла перапіска праз Сеціва з арганізатарамі фэсту, а таксама заяўленымі на “Славянскі базар у Віцебску” канкурсантамі з многіх і многіх краін свету. А потым нашы карэспандэнты сустракаліся з імі ў Мінску на генеральных рэпетыцыях, пасля якіх шлях канкурсантаў палягаў у Валошкавы горад над Заходняй Дзвіной...**
**Ну і, вядома, нараджэнне святочнага нумара “К”. Літаральна са станкоў цэха Дома друку — калі ўначы, калі а шостай раніцы — мы здымалі тысячу экземпляраў газеты і куляй ляцелі на машыне ў Міжнародны прэс-цэнтр, каб паспець пакласці шыкоўна афармлены нашым дызайнерам Наталляй Овад спецвыпуск “Культуры” на сталы для калег перад адкрыццём першай прэс-канферэнцыі. І так адбывалася штогод. Словам, усе дарогі ў ліпені вялі нас у Віцебск!**

Людміла КРУШЫНСКАЯ

Віцебск. Здымак Юрыя Іванова з верталёта.

Нашы рэпарцёры, асабліва ўсюдыісная Надзя Бунцэвіч, якая зазвычай паспявала ў ліпеньскім Віцебску набраць матэрыялаў, як кажуць, на год наперад, у тыя фестывальныя дні бадай і не марылі паспаць. Гэта каштавала, зразумела, сапраўднай самаахвярнасці дзеля падачы чытачам паўнацэннага кантэкста, які прыадчыняў бы дзверы ў розныя куточкі зорнай фестывальнай “кухні”. Узгадаю хіба толькі пару эпізодаў, што ўвайшлі ў гістарычны летапіс газеты, якой, дарэчы, сёлета спаўняецца таксама трыццаць гадоў і якая прысвяціла форуму ў сярэднім паўтысячы сваіх палос.

## ЯК АВІЯТАРЫ ДАПАМАГЛІ ФОТАКАРУ

...На той час фотакарэспандэнт “К”, знакаміты майстар Юрый Іваноў, які ўвайшоў у сотню лепшых фатографаў свету за свой легендарны здымак “Лятучка”, зрабіў нам на адным са “Славянскіх...” крэатыўны сюрпрыз. Такога наўрад ці можна было чакаць! Перад вячэрнім канцэртам у Амфітэатры мы на некалькі хвілін забеглі ў гасцініцу пераапрануцца. Раптам на мабільным прагучаў званок. Голас Юры: “Выйдзі на балкон, зірні на неба...” Літаральна над дахам гатэля “Ветразь” завіс верталёт, а з ягонага праёма бачна рука з фотаапаратам. Аказалася, што Юрый Сяргеевіч вырашыў паздымаць для першай паласы “Культуры” панараму святочнага Віцебска з вышыні “птушынага палёту”, і, пралятаючы міма “нашага квадрата”, паведаміў пра гэта. Урэшце, апусціўшыся з нябёсаў на зямлю, ён кінуў рэпліку пра тое, як яму ўдалося ажыццявіць невераятнае. Дык як? “Вельмі проста: дзякуючы любові беларускіх авіятараў да ўнікальнага фестывалю і павагі да работы фотарэпарцёра...”

Гэта і ёсць той самы сапраўдны эксклюзіў “К”, за які змагаліся мае нераўнадушныя калегі.

## АЗДАРАВІЦЬ ЗДРАЎНЁВА!

Другі яскравы эпізод, які доўжыўся ў прамым сэнсе цэлую пяцігодку, па вялікім рахунку, “эпізодам” назваць нельга. “Славянскі базар у Віцебску” ведае шмат гісторый, калі сфера ўплыву ягоных гасцей і ўдзельнікаў распаўсюдзілася далёка за межы Летняга амфітэатра. Так было і са шматгадовай акцыяй нашай “Культуры”.

...А пачыналася ўсё напрыканцы 1995-га. Тады ў нашу рэдакцыю прыйшоў ліст, які ў большай ступені нагадваў сігнал SOS. Да нас звярнуліся супрацоўнікі Дома-музея Іллі Рэпіна з просьбай надрукаваць зварот аб тэрміновай дапамозе. Справа ў тым, што дача славутага мастака ў Здраўнёве напаткала бяда: з-за няспраўнай электраправодкі дом, які Ілля Рэпін прыдбаў у гэтых мясцінах пасля продажу знакамітай карціны “Запарожцы пішуць пісьмо турэцкаму султану”, згарэў дашчэнту. А мясціны гэтыя на беразе хуткаплыннай Заходняй Дзвіны сапраўды незвычайнай прыгажосці. Тут вялікі жывапісец напісаў свае лепшыя творы апошняга дзесяцігоддзя XIX стагоддзя, якія сёння знаходзяцца ў нашым Нацыянальным мастацкім музеі: “Квітнеючыя яблыні”, “Беларус”, “Месяцовая ноч”, “Восеньскі букет”, “Селянін” ды іншыя.

Гэты райскі куток за сямнаццаць кіламетраў ад Віцебска стаў нам не проста родным па духу. Мы расцэньвалі свой удзел у лёсе гэтых беларускіх пенат як справу прафесійнага гонару. Летам 1996-га, у час правядзення чарговага “Славянскага базару...”, выязная рэдакцыя газеты “Культура” ўпершыню раскінула свой палатачны карпункт на тэрыторыі рэпінскай сядзібы, ад якой застаўся практычна хіба што падмурак. Побач з домам адзінока стаяла некранутая разбурэннем аўтэнтычная лядоўня, збудаваная для гаспадарчых патрэбаў сям’і геніяльнага творцы. Словам, карціна непрыглядная, і мала хто верыў, што гэтая сядзіба можа быць калісьці адноўлена. Але мы, “культураўцы”, не проста верылі. На старонках газеты з’явіўся шэраг праблемных матэрыялаў пра гэты выпадак, які быў заклікаць прыцягнуць увагу грамадскасці да сітуацыі.

## ПАДТРЫМКА ПРЭЗІДЭНТА

Праз год мы зноў прыехалі ў Здраўнёва. Толькі цяпер вырашылі правесці шэраг імправізаваных “круглых кастроў” па аналогіі з “круглымі сталамі”, на якія меркавалі запрасіць Міжнародны прэс-цэнтр “Славянскага базару...”, высокае начальства, ад якога непасрэдна залежала адраджэнне сядзібы, мясцовых жыхароў, каб яны маглі адчуваць сябе далучанымі да гэтай гістарычна значнай акцыі.

Перадыху ў нашага дэсанта не было і ў наступныя гады. Хтосьці з журналістаў працаваў на фестывальных пляцоўках і вакол іх. Але большасць толькі і паспявала мяняць у дыктафонах касеты — “цыфравых” яшчэ не было. Сустрэч ля “круглых кастроў” у Здраўнёва адбывалася мноства. Не буду распавядаць пра тое, як нас пачыналі жэрці камары, ад якіх не было адбою напрацягу сутак. Як бралі інтэрв’ю ва ўсіх турыстаў і дэлегацый, што завітвалі ў рэпінскія мясціны, зноў жа, каб потым “агучваць” іх думкі, прапановы і меркаванні на палосах газеты.

І, нарэшце, справа зрушыла з месца. Акрэдытаваныя журналісты з Міжнароднага прэс-цэнтра “Славянскага базару ў Віцебску” на старонках сваіх выданняў і ў радыёперадачах распавядалі пра лёс рэпінскай сядзібы. Потым яны дасылалі ў “Культуру” размаўлялі. Тут, у Здраўнёве, адбылася ў ліпеньскія дні канца 1990-х знамянальная сустрэча міністраў культуры трох славянскіх дзяржаў — Беларусі, Расіі і Украіны. Памятаю, як у адной з альтанак на алеі, якая была пасаджана пры Рэпіне, на тэрыторыі яшчэ не адроджанага Дома-музея мне давялося браць у тых высокіх гасцей інтэрв’ю, зноў жа з мэтай прыцягнуць увагу да спадчыны мастака, які меў непасрэднае дачыненне праз свой жыццёвы і творчы лёс да ўсіх трох названых вышэй краін. Заўважу: амаль дзесяць плённых гадоў Рэпін аддаў Беларусі.

Калі мне было даручана працаваць над фотаальбомам, прысвечаным пятнаццацігадоваму юбілею “Славянскага базару ў Віцебску” па заказе Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, у тэкставым матэрыяле я распавяла пра тое, як усё ж Здраўнёва паўстала з попелу. Дзякуючы акрэдытаваным на форуме журналістам, з падачы “культураўцаў”, быў ініцыяваны зварот знакамітых дзеячаў культуры і мастацтва, якія прыехалі на фестываль у Віцебск, да Прэзідэнтаў трох дзяржаў з просьбай дапамагчы адраджэнню Музею-сядзібе Іллі Рэпіна ў Здраўнёве. Прынамсі свае подпісы тады паставілі такія сусветна вядомыя зоркі, як Людміла Зыкіна, Уладзімір Мулявін, Іосіф Кабзон, знакамітыя кінематаграфісты, кампазітары, мастакі, пісьменнікі, журналісты — здаецца, аўтографаў было за сотню.

...І вось у рэдакцыю зноў прыйшоў ліст са Здраўнёва ад загадчыка Дома-музея Аляксея Сухарукава: “Сядзіба пачала ажываць...” Ішоў 1999-ты год. На першай паласе “Культуры” з’явіўся фотаздымак Гены Жынкова, які зафіксаваў, як клалі першы новы вянец на падмурак сядзібы.

...Міленіум. 2000 год. Ліпень. У першы фестывальны дзень Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ўрачыста адкрыў адроджаны літаральна з попелу казачны Музей-сядзібу ў Здраўнёве, на ўзнаўленне якога наша дзяржава выдаткавала грошы. Помнік ужо дваццаць гадоў жыве і дыхае мастацкімі пленерамі, шматлікімі экскурсіямі, канцэртамі, сустрэчамі. А мы ганарымся тым, што колішняя пяцігадовая акцыя “Культуры” была недарэмнай. Пра гэта нагадвае таксама “Залатое пяро”, уручанае аўтару гэтых радкоў на “Славянскім базары ў Віцебску”, якое сёння знаходзіцца ў часовай экспазіцыі Музея беларускай дзяржаўнасці.

Дом-музей Іллі Рэпіна "Здраўнёва".

свае публікацыі. У фестывальныя дні ў Здраўнёва на экскурсіі “прэс-цэнтраўцы” прывозілі знакамітых артыстаў і нават цэлыя калектывы. Прыязджаў Уладзімір Мулявін — у архівах рэдакцыі захаваўся яго “пленерны” фотаздымак каля здраўнёўскай сажалкі, які зрабіў фотакарэспандэнт “К” Генадзь Жынкоў. У наваколлі былі чутны раскацістыя спевы артыстаў Расійскага ансамбля казачай песні... Ды, урэшце, каго там толькі мы не сустракалі на нашых “круглых кастрах”, з кім толькі не

К

# Сем нот, трыццаць год

“Славянскі базар” – гэта тры дзесяцігоддзі нашага музычнага, сцэнічнага і выяўленчага мастацтва. І яшчэ важны эпізод, ці нават этап у гісторыі нашага дызайну. Тут ёсць пра што паразважаць, што асэнсаваць, з чаго зрабіць высновы. Галоўнае – ёсць чым ганарыцца, бо Беларусь мае імпрэзу ва ўсіх адносінах адпавядаючую міжнароднаму класу. Напярэдадні юбілею выйшаў з друку Каталог фірмовага стылю і сцэнаграфіі фестывалю. Да выдання прычыніліся Цэнтр культуры “Віцебск” і Дырэкцыя Міжнароднага фестывалю мастацтваў “СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ”. Назву каталог мае паэтычную – “Вандроўка даўжынёю ў трыццаць год”. На вокладцы карабель з ветразем-валошкай. Як сімвал пройдзенага шляху і няспыннага руху.

# Літаратурныя лекі з бібліяаптэкі...

**Пра бібліяаптэку мы яшчэ пагаворым. А зараз — пра рэчы не менш важныя. Свой першы твор Янка Купала напісаў па-польску, Якуб Колас — па-руску. Але кожны вярнуўся да родных вытокаў. Рашуча і канчаткова. Так бусел вяртаецца з выраю менавіта ў сваю буслянку… У кожнага — свой шлях да роднай мовы. У кагосьці ён кароткі і светлы, як ноч у чэрвені, у кагосьці — доўгі і пакручасты. А нехта ўвогуле выбірае шлях у супрацьлеглы бок. Пакутуе, не разумее, што з ім, але ўпарта працягвае блукаць ля роднага ганка. Усё гэта з дакладнасцю нагадвае пошукі веры. І вельмі важна, каб той, хто шукае, убачыў агонь паходні ў руках таго, хто знайшоў. Арыенрцір — гэта выключна важна.**
**Кожны, хто чытае гэтыя радкі — арыенцір для тых, хто не знайшоў пакуль ні мовы, ні веры, ні радзімы. Не падвядзіце!**

Яўген РАГІН

У сувязі з гэтым ніколі не забудуся на мудрасць свайго першага школьнага дырэктара Франца Паўлавіча Лешчанкі. Было гэта ў часіны кіравання Хрушчова, калі міласліва было дазволена адмовіцца ад вывучэння роднай мовы. Франц Паўлавіч казаў, разглядаючы бацькоўскія заявы: "Не, я магу падпісаць, але ж вы павінны ў перспектыву глядзець: ці ж можна стаць беларусам на беларускай зямлі без мовы беларускай!" Хто ў перспектыву глядзеў, той знайшоў. Хто лёгкіх шляхоў прагнуў, той згубіў так, што і па сёння ачуняць не здольны. Дык давайце ж жыць не толькі адным днём...

Назапасілася нізка лістоў, дзе аўтары ў любові да Беларусі прызнаюцца. Таксама справа пачэсная. Аліна Санюк з **Ашмян** распавядае: *"Падчас Дня Незалежнасці былі названы лепшыя працаўнікі народнай гаспадаркі раёна. У гонар свята выступілі лепшыя творчыя калектывы, а таксама — вучні Ашмянскай і* **Гальшанскай** *дзіцячых школ мастацтваў".*

Народная творчасць **Магілёўшчыны была прадстаўлена на тэматычнай выставе "Беларусь адзіная".** *"Выстава прайшла ў Палацы рэспублікі* **Мінска**, — піша вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага Цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Крысціна Башарымава. — *Экспанаваліся народныя касцюмы, ручнікі, іншыя традыцыйныя вырабы. Аўтары работ: ганчар Юрый Боўда з* **Бабруйскага** *раёна, ткачыха Таццяна Кавалёва з* **Хоцімшчыны**, *разьбяр Віктар Давыдаў з* **Касцюкоўшчыны**, *бондар Уладзімір Станкевіч з* **Глускага** *раёна, шапавал Таццяна Чараповіч і саломапляцельшчыцы з* **Кароўчынскага** *Дома рамёстваў* **Дрыбінскага** *раёна..."*

А вось пісьмо загадчыка **Казлоўшчынскай** гарпасялковай бібліятэкі — цэнтра агульнадаступнай інфармацыі Людмілы Хілімончык: *"Сёлета ў нас стартаваў краязнаўчы інтэрнэт-праект "Нашы землякі". На сайце* **Дзятлаўскай** *раённай бібліятэкі змешчаны ўжо два выпускі, дзе гаворка вядзецца пра нашых слаўных людзей. Другі анлайн-праект называецца "Духоўная каштоўнасць нашага пасёлка". Тут сабрана інфармацыя пра царкву Успення Прасвятой Багародзіцы, без якой немагчыма ўявіць гісторыю нашай мясцовасці. Выкарыстоўваем здабытую інфармацыю пры рабоце з вучнямі. Дарэчы, днямі дзевяцікласнікі здзейснілі краязнаўчае падарожжа "Мой край — часцінка Беларусі".*

Даўно не было вестак з **Бялынічаў**. Гэты недахоп кампенсавала сёння загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бялыніцкай цэнтралізаванай бібліятэчнай сеткі Марына Акунёва. Яна распавяла пра дзейнасць **Вішоўскай** сельскай бібліятэкі. Тут працуюць загадчыца Наталля Пікас, якая адначасова з'яўляецца супрацоўнікам музея гісторыі СПК "Калгас"Радзіма", і бібліятэкар Наталля Герчук. Абедзве Наталлі шчыльна супрацоўнічаюць з сельскім Цэнтрам культуры, балазе, установы месцяцца пад адным дахам, і з мясцовай школай. Летась супрацоўнікі бібліятэкі распрацавалі праект "Беларусь мая, як табой не ганарыцца! Родны край, як цябе не любіць!" Акцыя — доўгатэрміновая і звернута на выхаванне самасвядомасці падрастаючага пакалення.

А да жыхароў **Карэліцкага** раёна прыехалі на Дзень Незалежнасці госці з расійскага Краснагорска. Метадыст раённай бібліятэкі Наталля Казарэз распавядае, што сяброўства паміж пабрацімамі — Карэлічамі і Краснагорскам — доўжыцца амаль трыццаць гадоў. Сёлетняя сустрэча была, як і заўжды, доўгачаканай. Госці і гаспадары круцілі жорны, малолі муку, удзельнічалі ў квэсце "Ключ Беларусі", любаваліся Мірскім замкам.

Далей пра Дзень Незалежнасці тэлеграфным радком. Метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу **Ваўкавыскай** раённай бібліятэкі Вольга Шалястовіч паведамляе пра інтэрактыўную кніжную экспазіцыю "Твая зямля, твая Радзіма названа светла: Беларусь!" Дзейнічае яна ў гарадскім парку, прызначана для рознаўзроставай публікі.

**Бераставіцкая** раённая бібліятэка імя Восіпа Кавалеўскага прыняла ўдзел у раённым мерапрыемстве "Паклон табе, мой беларускі край!" Загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Валянціна Чыкун напісала пра кніжна-ілюстрацыйную экспазіцыю, дзе асаблівае месца займаюць фотаздымкі, франтавыя лісты,

**На здымках:**
**1 Аграгарадок, які чытае..**
**2 Прэзентацыя "Звычайнай кнігі…" у Лідскай гарадской дзіцячай бібліятэцы.**
**3 У "Шаўлічах".**
**4 Прэзентацыя традыцыйнай творчасці Магілёўшчыны ў Мінску.**
**5 Ашмяны святкуюць Дзень Незалежнасці.**
**6 Карэлічы і Краснагорск — пабрацімы ў атачэнні свята.**

плакаты, успаміны франтавікоў, іншыя экспанаты часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Метадыст Ірына Русак са **Свіслачы** піша пра канцэртную праграму "Я люблю Беларусь!", у якой былі задзейнічаны лепшыя творчыя сілы Свіслацкага раёна.

Тэматычныя кніжныя выставы былі падрыхтаваны і сіламі **Слонімскай** раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа. Паведаміла пра гэта Наталля Гурская — загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу згаданай установы.

Бібліятэкар **Талачынскай** цэнтральнай раённай бібліятэкі Ірына Труханёнак распавяла пра кніжны фрымаркет пад дэвізам "Глядзі, бяры, чытай! Спадабалася кніга — забірай!" Практыка паказала, што найбольш запатрабаванымі былі кнігі дзіцячыя і пра вайну. Мне асабіста вельмі спадабаўся рашучы падыход да рэкламнай дзейнасці ў Талачыне. Прынамсі, назва акцыі вельмі дынамічная.

Яшчэ адзін красамоўны прыклад бібліятэчнай рэкламы. Днямі ў аграгарадках Гродзеншчыны прайшла PR-акцыя "Мы — за чытаючы аграгарадок". Бібліятэкары прапанавалі навінкі на любы густ і любы ўзрост. У той дзень можна было запісацца ў аматарскія аб'яднанні, а таксама завесці бібліятэчны фармуляр.

Нізка навін пра Купалле і Купалу. 7 ліпеня бібліятэкі **Астравеччыны** адзначаюць "Купалаўскі дзень на Гродзеншчыне". Бібліятэкар па сувязях з грамадскасцю аддзела бібліятэчнага маркетынгу згаданай установы Вольга Заянчкоўская піша: *"У гарадскім скверы прайшла акцыя "Не змаўкае голас песняра". Адпаведныя мерапрыемствы прайшлі ў* **Мальскай**, **Рытанскай**, **Міхалішкаўскай** *і* **Падольскай** *сельскіх бібліятэках. Святы літаратурныя арганічна сумясціліся са святам абрадавым".* Кажуць нават, што ў тую ноч і Папараць-кветку знайшлі.

Бібліятэкары **Гродзенскага** раёна паўдзельнічалі ў конкурсе "Мой любімы Твор Купалы". Перамогу атрымала супрацоўніца **Азёрскай** сельскай бібліятэкі Інэса Васілевіч. Шкада, але што за твор Песняра любіць Інэса Юр'еўна, аўтарка ліста Карына Ошва так і не напісала.

У **Лідскай** гарадской дзіцячай бібліятэцы прайшла прэзентацыя выдання "Звычайная кніга пра незвычайнае ўсё". Бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы Кацярына Сандакова распавяла, што кнігу напісалі бацькі, якія жывуць з псіхічнымі захворваннямі і выхоўваюць дзяцей. Кніга вучыць разумець разнастайны свет. А створана яна ў рамках сацыяльнага праекта "Добрая казка", што рэалізуецца Асацыяцыяй беларускіх сацыяльных работнікаў пры падтрымцы кампаніі A1.

Прафесіянальны практыкум "Квэст у бібліятэцы" — тэма ліста са **Столінскай** раённай бібліятэкі Надзея Стахавец піша: *"Сёння дзейнасць бібліятэк павінна адпавядаць крэатыўнасці мыслення маладога пакалення. Сярод запатрабаваных гульнявых тэхналогій вылучаецца квэст. Днямі ў райбібліятэцы мы правялі для калег практыкум у форме квэста. Падчас яго бібліятэкарам трэба было прадэманстраваць эрудыцыю, знаходлівасць, выдатнае веданне літаратурных твораў. І бібліятэкары не падвялі".*

А цяпер — пра літаратурныя лекі з бібліяптэкі. Прыдумалі іх у **Ваўкавыскай** гарадской бібліятэцы № 46. Як распавядае бібліятэкар Юлія Міхалевіч, тут пачала дзейнічаць тэматычна-інтэрактыўная пляцоўка "Літаратурны дворык". Адначасова чытачы пераканаліся ў дзейснасці бібліятэрапіі і эфектыўнасці хуткай бібліятэчнай дапамогі. Юлія Міхалевіч тлумачыць: *"Даўно вядома, што ў цяжкія хвіліны жыцця людзі цягнуцца да кнігі: каб кепскія думкі адышлі, каб параду добрую атрымаць. Словам, чытанне можа лячыць не толькі псіхалагічныя, але і фізічныя хваробы. Бібліятэрапеўты могуць прапанаваць вам ці кніжную мікстуру, ці кніжны укол ад нуды, бяды і страху".* Варта даследаванне правесці, што больш гаючае — класіка ці мадэрн.

І апошняя на сёння навіна. 7 ліпеня ў мемарыяльным комплексе "Шаўлічы" **Ваўкавыскага** раёна супрацоўнікі раённага Цэнтра культуры правялі тэатралізаваны мітынг-рэквіем "Памятаць... Дзеля нашчадкаў, дзеля будучыні", прысвечаны памяці ахвяр фашызму. Менавіта ў гэты дзень 1943 года нямецкія акупанты знішчылі ўсіх жыхароў і спалілі вёску, якая так і не ўзнавілася. Пра гэта напісала загадчык аддзела РЦК Ларыса Ланіна.

Пішыце і здзіўляйце, шаноўныя. І беражыце сябе!

Сустрэнемся праз тыдзень.

К

# Спадчына мастака

## *На выставе ў Навагрудку*

**Напалеонам Ордам XX стагоддзя называюць сучаснага беларускага мастака Анатоля Наліваева, выстава карцін якога адкрылася напрыканцы чэрвеня ў Навагрудку ў гістарычным будынку кляштара братоў дамініканаў. Экспазіцыя налічвае 78 прац мастака, які адышоў у вечнасць на пачатку 2021 года, але пакінуў нам багатую мастацкую спадчыну.**

Анатоль Наліваеў.

На карцінах можна ўбачыць каталіцкія святыні з розных куткоў Беларусі і былых беларускіх зямель Віленшчыны. Таму і названа выстава тэматычна — "Храмы Радзімы". Гэта выявы касцёлаў, якіх ужо няма, або якія знаходзяцца ў занядбаным стане, а таксама тых, якія дзейнічаюць і адкрытыя для вернікаў і сёння.

На адкрыцці выставы з прывітальным словам да ўсіх удзельнікаў мерапрыемства выступіў пробашч парафіі Святога Міхала Арханёла ў Навагрудку ксёндз Юрый Жэгарын, які заўважыў, што "мастацтва з'яўляецца таксама праявай душы і духоўнасці чалавека".

"І сапраўды, калі чалавек глядзіць і сузірае, то можа нашмат хутчэй дайсці да прыгажосці Бога. Мы ведаем, што Бог — гэта не толькі Любоў, Свабода і Праўда, але таксама і Прыгажосць. Святы Тамаш Аквінскі казаў, што да Бога-Стварыцеля мы можам прыйсці таксама сузіраючы прыгажосць гэтага свету, прыгажосць стварэння чалавека. Таму заўсёды культура, мастацтва і вера ідуць побач", — заўважыў святар.

На імпрэзе таксама выказваліся думкі пра тое, што шмат касцёлаў і цэркваў, шмат малітоўных дамоў іншых веравызнанняў, на жаль, не дайшло да нашых дзён. Калі мы сёння едзем па нашай зямлі, то можам убачыць гэтыя развалiны, руіны. Вядома, што іх ужо, напэўна, ніхто не адновіць, аднак гэтая выстава дапамагае нам вярнуцца назад у гісторыю, паглядзець, што мы страцілі і зберагчы тое, што маем.

На выставе выступіў і прадстаўнік сям'і Анатоля Наліваева Спартак Аруцюнян і мастацтвазнаўца Ларыса Міхневіч, якая пазнаёміла ўдзельнікаў з асобай мастака.

"Анатоль Наліваеў не проста зрабіў такія малюнкі-фотаздымкі з дакладнасцю таго, што бачыў, ён як мастак-рэстаўратар захаваў вартасці сваіх малюнкаў, у іх адчуваецца паспяховасць накіду, нават нейкая пэўная неахайнасць і няўмеласць, таму што гэтыя накіды рабіліся хутка. Ён гэтыя рысы захаваў, і гэта асаблівы шарм гэтай выставы. Я хачу сказаць "дзякуй" за гэтае месца і экспазіцыю, таму што творы вісяць не на ўзроўні вачэй, а музычна размешчаны, скажу так, на розных узроўнях на сценах. І гэта дадае густу гэтай прасторы", — падзялілася Ларыса Міхневіч.

Жанчына заўважыла, што Анатоль быў чалавекам шматгранным, і нават на пенсіі "граў у тэатры і кіно, а таксама выключна спяваў".

**Анатоль Наліваеў — мастак, музыкант, рэстаўратар, кантар, тэатральны акцёр, а таксама збіральнік і выканаўца яўрэйскай кантарнай музыкі. Нарадзіўся 1 кастрычніка 1931 года ў Рагачове. Стаў галоўным героем фільма рэжысёра Юрыя Гарулёва "Вытокі", быў першым дырэктарам музея "Літаратурна-мастацкая гасцёўня імя В. Галубка" ў Мінску. Памёр 6 студзеня 2021 года ад наступстваў COVID-19.**

**Мастак з фатаграфічнай дакладнасцю перадаваў на сваіх карцінах не толькі храмы, але таксама розныя віды Мінска і іншых гарадоў і вёсак Беларусі, у асноўным звязаных з жыццём беларускіх яўрэяў. Таксама Анатоль напісаў дзясяткі партрэтаў знакамітых дзеячаў культуры і мастацтва Беларусі.**

**Марына ВАЛАСАР**

# Народная творчасць — падстава, каб абмяняцца думкамі

**Дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра НТ і КАР Алег Хмялькоў прыняў удзел у VII Усерасійскім з'ездзе кіраўнікоў метадычных службаў у сферы народнай творчасці.**

Алег Хмялькоў.

У дні Фалькларыяды з 1 па 5 ліпеня ў Чалябінску, Чалябінскай вобласці і Уфе праходзіў VII Усерасійскі з'езд кіраўнікоў метадычных службаў у сферы народнай творчасці. У мерапрыемстве бралі ўдзел дырэктары Дамоў і Цэнтраў народнай творчасці Расіі і Беларусі.

У рабоце з'езду прымаў удзел і Алег Хмялькоў, дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага Цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы, старшыня Рэспубліканскага Савета па пытаннях клубнай дзейнасці і народнай творчасці пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Удзельнікі абмеркавалі сучасныя тэндэнцыі захавання традыцыйнай культуры народаў Расіі, пазнаёміліся з культурнымі практыкамі вядучых устаноў культуры Чалябінскай вобласці.

1 ліпеня ў Чалябінску прайшло ўрачыстае адкрыццё з'езду і пленарнае пасяджэнне. 3 і 4 ліпеня з'езд прадоўжыўся ў Рэспубліцы Башкартастан. У гэтыя дні ва Уфе ўрачыста адкрылася VI Сусветная фальклярыяда і прайшла Міжнародная канферэнцыя CIOFF па культуры.

**Крысціна БАШАРЫМАВА,**
**вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра НТ і КАР**

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ /
Фота аўтара

# Сціплая ахвяра глыбінкі?

**Некалькі разоў на год нам з жонкай даводзіцца бываць у Гародні. Звыкла разлічвалі маршрут такім чынам, каб заспець трасу не перагружанай і праз гэта даехаць да сталіцы Панямоння як мага хутчэй. На сваім самаходзе атрымлівалася ад Мінска да Гародні недзе тры гадзіны. Так рабілі да нядаўняга часу, а потым вырашылі завядзёнку парушыць і ператварыць гэтыя паездкі ў невялікія вандроўкі, узбагаціць уражанне ад звыклай дарогі сякімі-такімі цікавосткамі.**

Напачатку наконт маршрутаў раіліся з дасведчанымі людзьмі і гарталі інтэрнэт, а зараз, маючы пэўны досвед, і самі можам штосьці параіць тым, хто хацеў бы лепей ведаць родную Беларусь. Вось гэтым разам, па дарозе ў той бок, наведалі Ашмяны, а на зваротным шляху — Шчучын ды Івянец. Планавалі яшчэ пабачыць Солы, дзе знаходзіцца адзін з самых прыгожых храмаў Беларусі — касцёл Маці Божай Ружанцавай (пабудаваны ў 1926 годзе ў рэдкім для нашай сакральнай архітэктуры стылі мадэрн), і Гервяты. Надзвычай прыгожы неагатычны гервяцкі касцёл, пабудаваны на мяжы XIX — XX стагоддзяў. Той, хто бачыць яго выяву ўпершыню, не верыць, што гэта Беларусь. Але не склалася... Гэтыя перліны наведаем наступным разам. Дасць Бог, дык і ў бліжэйшы час.

У Ашмяны выправіліся дзеля касцёла Архангела Міхаіла. Пабудаваны ў 1900 — 1910 гадах у стылі неабарока, храм выстаяў у дзвюх сусветных войнах, а зачынілі яго ў 1948 годзе на хвалі вайны з рэлігійнай свядомасцю. Скарыстоўваўся як вытворчае памяшканне. Вернуты вернікам у 1989-м. Даволі звычайная гісторыя. Бывала і горш. Мяркуючы па ступені захаванасці, храму яшчэ пашчасціла на сваіх часовых квартарантаў ад прамысловасці. Нават са знятымі крыжамі храм для мясцовага люду заставаўся святыняй і праз гэта захаваўся.

Сёння храму вяртаюць гістарычнае аблічча. Алтар ужо аздоблены карцінамі. Адна з іх настолькі мяне здзівіла, што я даслаў яе фатаграфію Андрэю Дубініну — мастаку-манументалісту, які мае досвед роспісу храмаў, з просьбай патлумачыць, новатвор гэта ці адноўлены/рэстаўраваны твор часу пабудовы храма. Рэч у тым, што святы Георгій вельмі падобны да... Напалеона. Мясцовы аўтар для алтарнай кампазіцыі ўзяў за ўзор славутае палатно славутага французскага мастака Жака Луі Давіда, прысвечанага аднаму з самых эфектных эпізодаў напалеонаўскай эпапеі. Гэта палатно — "Напалеон на перавале Сен-Бернар".

Вось што адказаў спадар Андрэй: "Цікавы варыянт іканаграфічнага пераўтварэння, звычайна новыя сюжэты ўкладаліся ў старыя іканаграфічныя формулы (як неаміфалагічны сюжэт "Раства Венеры" Бацічэлі ўклаў у візантыйскую схему "Хрышчэнне"). Тут, здаецца, яшчэ цікавей — Давід прадставіў Напалеона ў кампазіцыйнай схеме святога Георгія, а тут нанова павярнулі кампазіцыйную знаходку Давіда да першавытока, да схемы святога Георгія. У такой якасці здымка цяжка меркаваць, ці новатвор гэта. Здаецца, алтарны Георгій культурна напісаны ў "старой" тэхніцы, і тады маглі ўяўляць Напалеона вызваліцелем ад старога свету. Для сённяшняга дня гэта занадта мадэрністычна, на маю думку. Я сказаў бы, што твор аўтэнтычны..."

Івянец. Францысканскі касцёл.

Касцёл святой Тэрэзы ў Шчучыне.

Зрэшты, як я потым высветліў, ёсць і ў гісторыі расійскага мастацтва ікона святога Георгія, змаляваная з таго самага Давідаўскага "Напалеона". Мяркую, што незвычайная карціна паспрыяе славе Ашмянскага касцёла Архангела Міхаіла.

У Шчучыне, насупраць адзін аднаго, стаяць касцёл святой Тэрэзы (1829) і царква Міхаіла Архангела (1864 — 1865). Даволі характэрная для беларускіх гарадоў сітуацыя. Каталіцкі храм пабудаваны ў характэрным для канкрэтнай эпохі архітэктурным стылі, у дадзеным выпадку — класіцызм, а праваслаўны — у так званым псеўдарускім. Гэты стыль можна лічыць кансерватыўным і для Расіі пазачасавым. Культурных каранёў у беларускай глебе не меў і паўсюдна насаджаўся як знак ідэалагічнай імперскай прысутнасці ў краі. Але сёння гэта таксама частка нашай гісторыі і чыннік нашага культурніцкага ландшафту.

Івянец парадаваў адрэстаўраванымі храмамі. Францысканскі касцёл XVIII стагоддзя і Аляксееўскі 1907 года. За савецкім часам пра Івянец гаварылі выключна як пра цэнтр ганчарнай вытворчасці. Тое, што ён валодае архітэктурнымі перлінамі — свядома замоўчвалася. Івянец мог бы сёння быць архітэктурным запаведнікам, калі б у 70-я гады, праз нібыта добраўпарадкаванне горада, не быў знішчаны гістарычны цэнтр Івянца з малапавярховай забудовай, характэрнай для беларускіх мястэчак. Такое ў згаданы час адбывалася па ўсёй рэспубліцы.


*Якой аправы не стае архітэктурным дыяментам*
Сённяшні выгляд гродзенскага Старога замка.

"Трафейнымі" ідэямі карысталіся і каталікі, і праваслаўныя.

Касцёл Архангела Міхаіла ў Ашмянах.

Знак пашаны святому Францыску. Івянец.

70-я гады — гэта вельмі супярэчлівы час у гісторыі беларускай архітэктуры і горадабудаўніцтва. У 50 — 60-я гады нашы архітэктары засяроджваліся на стварэнні асноўных магістраляў і грамадскіх цэнтраў буйных гарадоў — на іншае папросту не было грошай і рэсурсаў, а ў 70-я дайшлі рукі да малых гарадоў і мястэчак. Але прызвычаіўшыся да буйных маштабаў, архітэктары са сталічнай фанабэрыяй у малых паселішчах пачыналі з таго, што расчышчалі пляцоўкі для чагосьці манументальнага, зусім гэтай прасторы не адпавядаючага ні маштабам, ні духам. Ахвярай такога мыслення станавіцца сціплая, але гарманічная забудова, што склалася гістарычна. Да таго ж і ваяўнічы атэізм дзяржаўнай ідэалогіі даваўся ў знакі. Менавіта ў гэты час у невялікіх паселішчах было знішчана мноства касцёлаў і цэркваў. Тут, на перыферыі, абараніць іх было цяжэй, чым у Гродне ці ў Мінску.

Вынік такой недальнабачнай горадабудаўнічай палітыкі мы адчулі ў 1980 годзе, калі Мінск быў уключаны разам з Масквой, Ленінградам, Кіевам і Талінам у "алімпійскую зборную". Вось дзе, здавалася б, нагода і магчымасць заявіць на ўвесь свет пра нашу нацыянальную культуру! Але паказваць гасцям алімпіяды ні ў Мінску, ні па рэспубліцы ўвогуле не было чаго.

Магчымасць адрадзіць нацыянальную спадчыну надарылася толькі з набыццём дзяржаўнага суверэнітэту. Гэтую ідэю, гэтыя стан і працэс для мяне сёння ўвасабляе часткова адбудаваны гродзенскі Стары замак. Тымі, хто памятае яго іншым, занядбаным, ён успрымаецца як нешта "відавочнае, неверагоднае". Як нешта знітаванае з мінулым і з будучым адначасова.

З таго, што бачыў крыху ў баку ад галоўных дарог Беларусі, я маю ўражанне, што пакуль праграма адраджэння датычыць толькі асобных, знакавых аб'ектаў. Але каб каштоўны камень зазіхацеў, яму трэба адпаведная аправа. Я так разумею, што надышоў час выпраўляць у горадабудаўніцтве памылкі савецкай эпохі — гэта значыць усур'ёз узяцца за адраджэнне гістарычнай аўры малых паселішчаў Беларусі. А амбітныя архітэктурныя праекты, у якіх адаб'ецца дынаміка новага часу, пакінуць вялікім гарадам і сталіцы краіны.

# Чытанне як індыкатар паспяховасці

**З 1 чэрвеня генеральным дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі стала Аксана Кніжнікава, якая змяніла на гэтай пасадзе Рамана Матульскага. Прызначаны кіраўнік — у прафесіі не навічок. Аксана Юр'еўна 20 гадоў працавала ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А.С. Пушкіна на розных пасадах, пачынаючы з бібліятэкара залы тэхнічнай, эканамічнай і сельскагаспадарчай літаратуры, а пасля і пяць гадоў узначальвала саму культурную ўстанову. "К" вырашыла бліжэй пазнаёміцца з новым кіраўніком "Нацыяналкі" і абмеркаваць актуальныя для бібліятэчнай сферы пытанні.**

Павел САЛАЎЁЎ.

*"Нацыяналка" ў люстэрку новых запытаў і тэндэнцый*

**— Аксана Юр'еўна, падзяліцеся, калі ласка, якія задачы паставіў перад вамі міністр культуры Анатолій Маркевіч, прадстаўляючы калектыву?**

— Міністр дакладна вызначыў, што патрабуецца ад мяне. Гэта падтрымане ў калектыве станоўчай атмасферы і ўмоў, накіраваных на прафесійнае развіццё, выраўноўванне эканамічных паказчыкаў з наступным выхадам на станоўчую дынаміку, умацаванне ролі Нацыянальнай бібліятэкі як навукова-метадычнага цэнтра і сістэмаўтваральнага звяна адзінай бібліятэчнай прасторы рэспублікі. Гэта значыць, што нам трэба будзе надаць новы імпульс развіццю бібліятэкі, захаваўшы пры гэтым лепшыя традыцыі і прафесійны калектыў. Бо менавіта дзякуючы нашым супрацоўнікам Нацыянальная бібліятэка Беларусі займае аўтарытэтную пазіцыю ў сусветнай бібліятэчнай супольнасці.

Думаю, што мне, як кіраўніку, недапушчальная мітусня. Бібліятэка сусветнага маштабу і значэння не можа быць звязаная з паспешлівасцю і павярхоўным разуменнем спраў. Частка яе стратэгічных функцый распісана на дзесяцігоддзі наперад. І перш чым прадпрымаць сур'ёзныя рашэнні, неабходна ўважліва вывучыць сітуацыю. Таму я гатовая з энтузіязмам уключыцца ў працу бібліятэкі, у рамках дзяржаўнай культурнай палітыкі рэалізоўваць раней намечаныя планы, і з часам прапаноўваць новыя ідэі.

**— Якая спецыфіка кіравання флагманам бібліятэчнай сферы краіны, з якой руцінай сутыкаецеся?**

— Кіраваць калектывам перш за ўсё няпроста з пункту гледжання маральна-псіхалагічнага, асабліва, калі гэта вялікі калектыў. Часам даводзіцца браць на сябе адказнасць за прыняцце непапулярных рашэнняў, часам быць жорсткай пры вырашэнні канфліктаў. Пры гэтым разумею, што кіраўнік павінен заставацца гнуткім. Таму стараюся не дзейнічаць эмацыйна і не карыстацца аўтарытарным правам дырэктара.

Разам з тым, кіраўнічая пасада загартоўвае характар і пашырае кругагляд. За гады працы навучылася разбірацца ў бухгалтэрыі, будаўніцтве, юрыспрудэнцыі...

**— Вы бывалі на стажыроўках па бібліятэчнай справе ў некаторых замежных краінах, у тым ліку ЗША. Як за мяжой працуе бібліятэчная сістэма, якія ў яе адрозненні ад беларускай?**

— На самой справе, прафесійныя візіты да замежных калег — гэта ўнікальны вопыт, які фарміруе бачанне альтэрнатыў. Яны не толькі спрыяюць павышэнню прафесійнага ўзроўню, а і даюць штуршок да развіцця. Але калі пачынаеш параўноўваць, разумееш, што ў бібліятэчнай справе здараецца больш супадзенняў, чым адрозненняў. У любой краіне свету бібліятэкі працуюць на інфармацыйным рынку па існуючых правілах, задавальняючы попыт на тую інфармацыю, якая запатрабавана. Раней мы, гэтак жа, як і нашы замежныя калегі, больш працавалі з традыцыйнымі носьбітамі інфармацыі, цяпер выкарыстоўваем новыя інфармацыйныя тэхналогіі, займаемся распрацоўкай віртуальных сэрвісаў, развіваем тэхналогіі электроннай дастаўкі дакументаў. Так і за гады працы ў абласной бібліятэцы я змагла назіраць, як яна пашырала сферу ўзаемадзеяння з грамадствам, паступова ператвараючыся з "захавальніцы" бібліятэчных дакументаў у элемент гарадской інфармацыйнай інфраструктуры, адукацыйны цэнтр і камунікатыўную пляцоўку.

Што ж тычыцца адрозненняў нашых замежных калег, то ў ЗША адзначу высокую сацыяльную нагрузку публічных бібліятэк. Мігранты туды ідуць, каб наведаць бясплатныя моўныя курсы, атрымаць дапамогу ў афармленні дакументаў; маладыя мамы — каб правесці вольны час з дзецьмі; беспрацоўныя — каб запоўніць анкеты і пашукаць прыдатныя вакансіі. Часцяком бібліятэка з'яўляецца адзінай кропкай доступу да інфармацыі з бясплатным кансультантам. Таму ў публічных бібліятэках заўсёды вельмі шмат самай разнастайнай публікі. У Германіі мяне ўразілі студэнты, якія раніцай займаюць месцы ў чытальнай зале, каб мець магчымасць працаваць там на працягу дня. Напэўна, таму, што нашы выкладчыкі на занятках даюць шмат матэрыялу, а за мяжой студэнт сканцэнтраваны на самастойнай працы.

> **"Бібліятэка — структура, якая дынамічна развіваецца, заўсёды адаптуецца да сучасных умоў. Яна адкрыта для развіцця новых напрамкаў і рэалізацыі нестандартных праектаў. І самі бібліятэкары, арыентаваныя на прафесію, заўсёды знойдуць, дзе і чаму павучыцца".**

У паездках за мяжу я не сутыкалася з бібліятэчным вопытам, які катэгарычна непрымальны для нас. Проста штосьці немэтазгодна рабіць, бо гэта будзе дубляваць функцыі іншай установы (напрыклад, нашых службаў занятасці) і не будзе эфектыўным.

**— Як павінна змяняцца бібліятэчная справа і функцыі саміх бібліятэк, каб працягваць быць запатрабаванымі?**

— Грамадства развіваецца, і не трэба з гэтым змагацца. Мы павінны зрабіць усё магчымае для стварэння нашым карыстальнікам камфортнай абстаноўкі і спрыяць рацыянальнаму выкарыстанню іх часу.

Калісьці друкаваная кніга замяніла рукапісную, потым з'явіліся электронныя кнігі, поўнатэкставыя базы даных. Ідучы ў нагу з часам, бібліятэкары пастаянна мяняюць падыходы да абслугоўвання карыстальнікаў, і жыццё па-ранейшаму дэманструе цікавасць да гэтага сацыяльнага інстытута. Наша задача — прадбачыць, як бібліятэка будзе рэалізоўваць свае функцыі з улікам новых запытаў і тэндэнцый.

Вось, да прыкладу, пандэмія ўнесла карэктывы ў наша жыццё, і стала відавочна, што неабходна надаваць большую ўвагу фарміраванню рэсурсаў, доступ да якіх забяспечваецца аддалена. Таму ў перспектыўных планах — стварэнне рэгіянальных лічбавых цэнтраў бібліятэчных дакументаў і фарміраванне электроннай бібліятэкі.

**— Ці магчыма вярнуць папулярнасць чытання, як гэта было ў гады СССР?**

— Мы, вядома, можам узгадваць, што былі самай чытаючай краінай у свеце ў тыя часы, але трэба ўсвядоміць, што цяпер тэмп жыцця паскорыўся, развіццё грамадства далёка пайшло наперад, у тым ліку, і яго тэхнічныя магчымасці. Безумоўна, неабходна стымуляваць сістэму мер, накіраваных на развіццё чытання, імкнуцца, каб сацыяльныя інстытуты, што прасоўваюць чытанне, адпавядалі сучаснаму ўзроўню. Але наўрад ці мы вернемся ў тыя ж 70-я.

Я б і не сказала, што людзі зусім перасталі чытаць. Наадварот, цяпер гэта нават становіцца модным: чытанне з'яўляецца свайго роду індыкатарам паспяховасці. Проста кніга і перыядычныя выданні ў звыклым разуменні перасталі быць адзінымі крыніцамі інфармацыі.

**— Ці гатовыя бібліятэчныя спецыялісты да пераменаў і развіцця?**

— Думаю, так. Прагрэсіўныя тэхналогіі, напрыклад, ужо даўно сталі неад'емнай часткай бібліятэчнага працэсу, шмат у чым спрасціўшы сістэму апрацоўкі і пошуку інфармацыі. Бібліятэка — структура, якая дынамічна развіваецца, заўсёды адаптуецца да сучасных умоў. Яна адкрыта для развіцця новых напрамкаў і рэалізацыі нестандартных праектаў. І самі бібліятэкары, арыентаваныя на прафесію, заўсёды знойдуць, дзе і чаму павучыцца. Тым больш, што асаблівасць нашай прафесіі заключаецца ў тым, што няма межаў, якія можна было б для яе абазначыць. Наведванне курсаў павышэння кваліфікацыі, семінараў, удзел у майстар-класах, чытанне прафесійнай літаратуры, абмен вопытам з калегамі — гэта толькі невялікі спіс дзеянняў, якія дапамагаюць удасканальвацца і дасягаць пэўнага майстэрства ў бібліятэчнай справе. Так што некаторым спецыялістам не хапае нават 24-х гадзін у суткі для самарэалізацыі і рэалізацыі ўсіх задуманых праектаў.

**— На жаль, у бібліятэчнай сферы не самыя вялікія зарплаты. Як выправіць гэтую сітуацыю?**

— Пытанне вельмі складанае. Колькі сябе памятаю ў прафесіі, столькі абмяркоўваюць шляхі і спосабы павелічэння зарплаты бібліятэкараў, але аптымальнае рашэнне ніяк не прыходзіць. Напэўна, наша прафесія падзвіжніцкая, і невысокі матэрыяльны даход кампенсуецца іншымі, нематэрыяльнымі перавагамі.

К

**Гутарачы з улюбёнымі ў справу спецыялістамі, ты разумееш, што рэстаўрацыя — гэта зусім не тыя панылыя выразы твараў, якія мы дасюль раз-пораз бачым на вуліцах у адной няўдалай сацыяльнай рэкламе. Гэта інтрыга, творчыя дылемы, інтэлектуальны выклік, сюжэтныя піруэты… Выстава творчай суполкі "Басталія", што экспанавалася ў чэрвені ў Нацыянальным гістарычным музеі, цудоўна гэта засведчыла. А зараз — свайго кшталту каментарыі да яе.**
**Пра тое, як адрозніць рэстаўрацыю ад падробкі, мы гутарым з кіраўніком суполкі Фёдарам САРОКАМ і яе ўдзельнікамі Ігарам КНЫШАМ, Іванам МЯДЗВЕДЗЁВЫМ і Катажынай ШАЎРУК.**

Ілья СВІРЫН

Аднаўленне роспісу ў Мсціславе.

Фрагмент інтэр'ера капліцы ў Нясвіжскім замку.

# Пракруставы ложак рэстаўрацыі, або Як пазбегнуць падробкі?

## ПАДЫХОД ДА ФЕНОМЕНУ

**— Ваша суполка існуе ўжо каля паўстагоддзя. За гэты час многае ў нашым жыцці змянілася. Але наколькі тыя пературбацыі паўплывалі на тую спецыфічную галіну, якую вы для сябе абралі?**

Фёдар САРОКА: Раней, як кажуць, усё было раўней. У сэнсе, куды спакайней, без гэтага вытворчага гону. Сёння ж у рэстаўрацыі дзве праблемы. Першая — калі няма грошай, а другая - калі яны ёсць, і трэба іх хутка засвойваць. А кожны аб'ект паводле тэрмінаў бадай непрадказальны. Гэта ж не цэглу штампаваць! Помнікі — гэта нібы пацыенты лякарні, кожны з якіх хворы трохі па-свойму. Тут няма нейкіх універсальных лекаў. Ты ніколі не ведаеш, якія выклікі тоящца ў глыбі муроў, і колькі часу спатрэбіцца, каб знайсці аптымальнае рашэнне.

**Ігар КНЫШ:** Раней навукоўцы, архітэктары, рэстаўратары працавалі пад адным дахам, цяпер жа кожны сам па сабе.

**ФС:** Хаця рэстаўрацыя павінна быць справай калектыўнай.

**— У вас нават на выставе гэта заўважна: канкрэтныя аўтары праектаў амаль нідзе не пазначаныя, паўсюль толькі суполка. А ці не ўзнікаюць унутры яе супярэчнасці і непаразуменні? Пагатоў, справа ж далікатная...**

**Іван МЯДЗВЕДЗЁЎ:** Яшчэ як узнікаюць! Менавіта ў іх і нараджаюцца ўзважаныя рашэнні.

**ФС:** Самая цяжкая рада для нас — гэта не Рэспубліканская навукова-метадычная (з ёй акурат ніякіх праблем не ўзнікае), але менавіта свая, унутраная. Бо калі нам удасца прыняць калектыўнае рашэнне, пра астатняе ўжо можна не хваляваца.

А наконт імёнаў — гэта таксама наш прынцып. Ніхто з нас не валодае сакрэтам пораху - як у свой час кітайцы. Ды і наогул сакрэтаў не маем. У нас на кожным аб'екце заўсёды працуюць студэнты, вось і на выставе іх багата было. У некаторых, здаецца, вочы гарэлі... Спадзяюся, нехта абярэ рэстаўрацыю ў якасці справы жыцця.

**— А як яе выбралі для сябе вы?**

**ІМ:** На пачатку мы былі проста маладымі мастакамі, кожны з якіх бачыў свой шлях па-свойму.

**ФС:** Не паверыце, але калі мы вучыліся ў Тэатральна-мастацкім, ніхто з нас аб гэтай прафесіі не марыў. Яна здавалася сумнай, карпатлівай. Гэта ўжо куды пазней мы ўсвядомілі, што насамрэч творчасць тут віруе. Ды і рэстаўрацыйнае ўмельства ў інстытуце не выкладалі. Каб дасканала яго засвоіць, нам потым давядзецца выпраўляцца ў іншыя гарады — Венецыю, Рым, Маскву... Але найперш уся навука ідзе ад практыкі.

**ІМ:** Галоўнае — нам пашчасціла з выкладчыкам. Алег Уладзіміравіч Хадыка вазіў нас у Мсціслаў на рэстаўрацыю фрэсак кармеліцкага касцёла. Хто туды на практыку ездзіў, хто проста адпачыць — памаляваць, пакупацца... Цудоўны горад, дзе "тусоўка" спалучалася з вучобай і наогул станаўленнем асобы. Бо калі слухаеш, як разважаюць старэйшыя ды мудрэйшыя, міжволі і сам набіраешся розуму.

**ФС:** Алег Хадыка заклаў у нас галоўны прынцып: рэстаўрацыя — гэта не толькі вузкаспецыфічныя навыкі і праца рукамі. Гэта шматмерная творчая ды інтэлектуальная дзейнасць, якая абавязкова ахоплівае і культурнае атачэнне аб'екта альбо мясцовасці. Ты не можаш аднаўляць сінагогу, не ведаючы, якія песні спявалі мясцовыя яўрэі, не можаш узяцца за фрэску ў касцёле, дасканала не вывучыўшы яе сюжэт у гістарычнай перспектыве. Нельга знайсці падыход да таго ці іншага феномену, не ўсвядоміўшы той культурны кантэкст, што яго стварае.

**ІК:** Тэхнічная рэстаўрацыя — рэч малакарысная і малацікавая. Мы заўсёды ўседамлялі, што аднаўляем не толькі выявы, але і культурны пласт, які іх спарадзіў.

**— Але многія вас шануюць акурат за дасканалае валоданне тэхнікамі рэстаўрацыі. Як вы іх засвоілі?**

**ІМ:** Практыка, менавіта практыка... На пачатку ніхто з нас - за выключэннем хіба тых, хто вучыўся на манументальным — не ўмеў працаваць з тынкоўкай. Цяпер жа кожны яе засвоіў. Тое самае і выцягванне гзымсаў. Мы гэта ўласнаручна рабілі ў мінскім Петрапаўлаўскім саборы, дзе трэба было захаваць і праэкспанаваць ацалелыя фрагменты арак між навамі.


Палімпсест Пестрапаўлаўскага сабора.

**ІК:** Калі мы прыязджалі ў Італію, на нас глядзелі ледзь не як на тытанаў Адраджэння: вы так шмат усяго ўмееце, так грунтоўна разважаеце! Там у рэстаўрацыі працуюць пераважна вузкія спецыялісты, не мастакі. Яны могуць раскрыць, пачысціць сценапіс...

## АЎТЭНТЫКА НЯСВІЖА

**— Падазраю, гэта праз тое, што ў Італіі інтэр'еры захаваліся куды лепей. У нас жа іх часцяком даводзіцца папраўдзе вяртаць з нябыту. І калі вонкавы выгляд помніка зазвычай можна аднавіць па ацалелых іканаграфічных матэрыялах, роспісы незваротна знікаюць куды часцей. Як тут рэстаўратару пазбегнуць папрокаў у "неаўтэнтычнасці"?**

**ІК:** Калі нас паклікалі аднаўляць капліцу ў Нясвіжскім замку, там засталося не болей за 5% сценапісу. Навуковы кіраўнік Сяргей Аляксандравіч Друшчыц нас выклікаў і сказаў: хлопцы, вазьміцеся, я даю гэты аб'ект цалкам пад вашу адказнасць, і ніхто не будзе перашкаджаць. Дзякуючы яго даверу, мы збольшага здзейснілі задуманае — нягледзячы на сціслыя тэрміны. Па рэштачках, па аналагах рэканструявалі тое, што ў капліцы *магло быць*. Зразумела, максімальна захаваўшы аўтэнтычныя фрагменты. Да таго ж, адразу паставілі перад сабой задачу рабіць рэканструкцыю не сучаснымі матэрыяламі, але засвоіць менавіта тую тэхніку фрэскі, якая выкарыстоўвалася ў капліцы.

І вось, у Нясвіж прыехала Альжбета Радзівіл — а яна была ўжо ў тым веку, калі хлусіць не выпадае. Колішняя жыхарка замка зайшла ў капліцу і сказала: "О, а тут усё менавіта так і было!" І да сённяшняга дня экскурсаводы часам сцвярджаюць, што рэстаўратары туп нічога не чапалі — усё захавалася "як было". Мы не спяшаемся іх расчароўваць *(смяецца)*.

**ІМ:** Плафон капліцы мсціслаўскага касцёла, які мы аднавілі на пачатку 80-х, быў прыведзены ў якасці прыкладу ў першым савецкім падручніку па рэстаўрацыі. А гісторыя была якая: мы выпадкова ўбачылі што на дошках скрыні вапны ёсць рэшткі фарбы. Як выявілася гэта былі фошкі з плафонам капліцы! Скрыні разабралі, і паколькі фрагментаў роспіса захавалася вельмі мала, перад намі паўстала пытанне: што ж рабіць у дадзеным выпадку?

**ФС:** Для рэстаўрацыі звычайная з'ява, калі сутыкаешся з новай справай, і шмат што прыходзіцца рабіць упершыню. Напрыклад, адслаенне алейнага роспісу і перанос яго на новую аснову выконваўся адначасова з асваеннем новых тэхналогій. Потым перанесеныя на новую аснову фрагменты былі змантаваныя на плафоне. Так аўтэнтычны роспіс вярнуўся на сваё месца ў гэтай капліцы — якую, згодна з савецкай традыцыяй, тады прыстасоўвалі пад клуб планерыстаў.

**ІМ:** Але галоўнае, што тады, у Мсціславе, мы распрацавалі сваю методыку аднаўлення такіх збольшага страчаных помнікаў. На пачатку вызначаем чатыры ўзроўні гіпатэтычнасці: 1) аўтэнтыка — ці, як кажуць рэстаўратары, "аўтар", 2) тое, што магчыма аднавіць паводле наяўных крыніцаў, 3) тое, што аднавіць магчыма, але гэта будзе пад пытаннем, і ўрэшце 4) тое, што аднавіць немагчыма.

Гэты падыход візуальна ўвасабляецца ў колеры. "Аўтар" застаецца ў тым выглядзе, якім ён захаваўся, астатняя плошча фарбуецца ў шэры колер, складнікамі якога з'яўляецца каляровая "аўтарская" палітра. І далей па шкале гіпатэтычнасці: у шэрым праз вускія палоскі з'яўляецца каляровая рэканструкцыя. Пры гэтым, чым менш мы маем доказаў, што так яно было, тым вузейшыя палоскі каляровай рэканструкцыі "аўтара". Калі зусім невядомы фрагмент, то мы бачым толькі шэрую заслону.

І менавіта гэты падыход адрозніваe рэстаўрацыю ад падробкі.

**— Але што такое падробка ў тым выпадку, калі аўтэнтыка, на жаль, страчаная?**

**ІМ:** Падробка — гэта калі адноўленыя табою роспісы не адрозніваюцца ад аўтэнтычных. Вось таму мы і ставім за мэту, каб абавязкова было відаць і аўтарскі арыгінал, і час, які папрацаваў над гэтымі сценамі, і непасрэдна наш унёсак.

**ФС:** Прынцыпова мы займаемся экспазіцыйнай кансервацыяй роспісаў і аб'екта цалкам. Галоўная задача -- не аднавіць "як яно было", а захаваць арыгінал і паказаць, як яно стваралася.

**ІК:** Наша крэда — ні ў якім разе не кранаць аўтара.

**ІМ:** Так, там, дзе роспіс страчаны, мы можам яго дапоўніць — калі гэта дарэчы. Але паміж аўтарам і новаўводзінамі абавязкова павінна быць мяжа, кантраст, стык. Хаця, у той самы час, аўтэнтыка і адноўленая частка маюць стварацца цэльную кампазіцыю.

**ФС:** У вілейскім касцёле рэшткі арыгінальных роспісаў мы пакінулі каляровымі, а свае рэканструкцыі зрабілі шэрым, у грызайлі. Вельмі важна, каб арыгінал выразна адрозніваўся ад працы рэстаўратара. Каб гэтае адрозненне было відаць няўзброеным вокам.

## "НАРОД НЕ ЗРАЗУМЕЕ"?

**— Гэты падыход і сапраўды адпавядае сусветным прынцыпам рэстаўрацыі. Але ці не баіцеся вы, што яго "народ не поймет"? Многія ж хочуць бачыць найперш прыгожую карцінку…**

**ФС:** У Рыме або Афінах антычныя помнікі стаяць у руінах зусім не таму, што яны такія бедныя і не могуць іх аднавіць. Чаму ж тады ніхто не дбае, каб зрабіць з іх цукерку?

**ІМ:** Паверце, мне гэта не раз давозілася чуць: маўляў, людзям трэба золата, срэбра, яркія колеры... Але са свайго досведу магу запярэчыць: народ разумее, калі ты яму тлумачыш, чаму пакідаеш амаль так, як было, з мінімальным умяшальніцтвам. Не раз у касцёле падыходзілі бабулькі ды пыталі: вы так хораша працуеце, а ці хутка ўжо фарбаваць пачнеце? Але калі ты ўступаеш з імі ў дыялог, іх бачанне прыгажосці мяняецца: авой, гэта ж і так хораша, без новай фарбы! Тыя роспісы і мая мама бачыла, і бабуля... Таму выраз "народ не зразумее" мяне не бянтэжыць.

**ІК:** Часам цяжэй прафесіяналу патлумачыць, ніж простаму чалавеку.

**Катажына ШАЎРУК:** Пагатоў, грамадская думка таксама з часам мяняецца. Прыходзяць новыя пакаленні, і ўяўленне пра прыгажосць у іх ужо трохі іншае. З'яўляецца гарадская культура. Мы гэта адчулі, калі працавалі на мінскай фабрыцы-кухні — аб'екце, разлічаным перадусім на моладзь. Узрадавала пазіцыя заказчыка — не зрабіць гламурны рамонт, але раскрыць і паказаць гісторыю, даць магчымасць адчуць час, ход якога можна ўбачыць наўпрост на сцяне.

**— Фабрыка-кухня з яе шматслойнымі роспісамі - будынак адносна сучасны, яму і ста гадоў яшчэ няма. Таму задам вечнае пытанне: што ж такое спадчына? У які момант "звычайны" аб'ект набывае статус помніка?**

**ФС:** Аднойчы паехаў на магілы бацькоў, і трэба было запаліць там свечку. Абгарэлую запалку я паклаў у кішэню — бо куды яе на цвінтары шчэ падзець? А праз нейкі час раптам знайшоў — і не змог ужо выкінуць. Для мяне яна ўжо несла памяць.

**КШ:** Тыя ж альфрэйныя роспісы з рознымі кветачкамі некалі былі ў штодзённым ужытку, ледзь не ў кожнай кватэры. Але маё пакаленне іх у побыце ўжо не заспела, і таму для нас гэта нешта сапраўды гістарычнае, мы на гэта глядзім неяк іначай, ніж продкі. Калі мне давялося працаваць на Ракаўскай, 17 (аб'ект, на жаль, дасюль незавершаны), не раз бачыла гэтае захапленне ў тых людзей, што па розных справах туды завітвалі. Убачыўшы вялікую раскрытую сцяну з роспісамі розных часоў, яны казалі: ого, як прыгожа, ажно мурашкі бягуць па скуры, няўжо ў нас такое захавалася! Хаця, здавалася б, звычайная альфрэйка...

**ФС:** Вельмі радуе стаўленне маладзейшых. Яны шануюць нават тую спадчыну, якая мае ўсяго пару дзесяцігоддзяў.

**ІМ:** Не так даўно ў цэнтры Мінска адкрылася новая модная кавярня, дзе падчас рамонту былі выяўленыя роспісы савецкіх часоў. І новыя гаспадары па сваёй волі іх захавалі. Усведамляючы, што гэта — спадчына.

## БЕЗ СУСАЛЬНАГА ЗОЛАТА...

**— Час задаць пытанне і пра паразуменне з замоўцам. Рэстаўрацыя ж - справа прыкладная, яна моцна залежыць ад волі ўласніка і фундатара.**

**ФС:** На тое, каб дасягнуць з ім паразумення, у нас сыходзіць да 50% агульных высілкаў. Стасункі з замоўцам уваходзяць у тыя "міражы", якія неад'емна прысутнічаюць у любой рэстаўрацыі — нейкі чыста кантэкстуальны складнік, які нібыта наўпрост не мае дачынення да справы, але насамрэч без яго ніяк. З пошуку пачынаецца любая наша праца.

**ІМ:** Неяк пробашч касцёла ў Глыбокім вырашыў зрабіць звычайны рамонт. Пачалі збіваць тынкоўку — і раптам адкрыўся жывапіс. Святар выклікаў нас.

**ФС:** Прасцей за ўсё, вядома, было гэта зафарбаваць, але...

**ІК:** Як выявілася, роспісы былі сучаснымі, але рабіліся яны паводле старадаўніх узораў. Мы працавалі гады два, і ў выніку сёння экскурсаводы прыводзяць туды турыстаў паглядзець на XVIII стагоддзе. А парафіяне даведаліся пра выраз "гіпатэтычная рэканструкцыя".

**ФС:** І цяпер святар кажа: дзякуй, што вы мне раскрылі вочы на сакральнае мастацтва! Гэта папраўдзе шчаслівы выпадак, і ён не адзінкавы. Згадайма таго ж настаяцеля Петрапаўлаўскага сабора Георгія Латушку...

**ІМ:** На пачатку ён не надта разумеў, што і навошта мы робім: скажам, тыя ж зандажы... Але потым нават сам праяўляў ініцыятыву: хлопцы, вы ж яшчэ тут і тут не даследавалі.

**ФС:** Калі ў 1992 годзе "Басталія" пачынала працаваць на гэтым аб'екце, нам казалі: трэба аднаўляць у першапачатковым выглядзе - то бок, на XVII ст. Мы пярэчылі: прабачце, але задача пастаўленая няправільна. Па-першае, ад таго роспісу ацалелі адзінкавыя фрагменты, а па-другое — ці не праз кожныя паўстагоддзя там з'яўляўся новы слой, таксама каштоўны і яркі прыклад свайго часу. У выніку, на сваім настаялі.

Удзельнікі суполкі "Басталія" на выставе "Зандажы і міражы рэстаўрацыі".

**ІК:** Той жа апостал Фама на пілоне, дзе пяць слаёў роспісу захаваліся толькі ў асобных фрагментах. Убачыць там цалкам карціну цяжка. Мы замацавалі аўтэнтычную шматслойную фактуру і аб'яднаўшы ўсё нанесеным паверх ізводам выявыапостала. І настаяцель такі падыход цалкам прыняў. Хаця часам кажуць: гэта ж царква або касцёл, тут усё павінна быць зразумела.

## ТРЫ ТАЧКІ... ДАКУМЕНТАЦЫІ

**— Ці ахвотна сёння ідзе моладзь у рэстаўрацыю? Ці ёсць пераемнасць традыцый?**

**ІМ**: На ўсіх сваіх аб'ектах мы стараемся набіраць студэнтаў самых розных спецыяльнасцяў: не толькі мастакоў, але і інжынераў, тэхнолагаў. Зразумела, далёка не ўсе звяжуць лёс з рэстаўрацыяй. Але для іх гэта ў кожным разе будзе важны досвед. Калі чалавек пачынае разумець, што патрабуе адмысловага падыходу — значыць, ты нездарма запрашаў.

**ФС:** Іван, ты праўду кажы! Студэнтаў мы запрашаем з чыста эгаістычных меркаванняў - каб самім не страчваць форму. Моладзь заўсёды прымушае цябе быць у тонусе. Каб яе зацікавіць, мусіш ледзь не са скуры вылузвацца. І фальш тут не схаваеш. Як слушна сказаў паэт Вінакураў: "Художник, воспитай ученика, чтобы было у кого учиться".

Але для мяне і сапраўды вялікая радасць, калі нехта праз гады кажа: дзякуючы вам я выбраў свой шлях.

**ІК:** Толькі на матэрыялах Лошыцкай сядзібы 8 дыпломаў было абаронена.

**— Вы аддалі процьму часу і высілкаў даследаванню і аднаўленню роспісаў у мсціслаўскім кармеліцкім касцёле і слонімскай сінагоге. Аднак будучыня абодвух аб'ектаў дасюль даволі няпэўная — як, на жаль, і многіх іншых…**

**ІМ:** Прыходзячы працаваць на той ці іншы помнік, мы перш-наперш робім яго фотафіксацыю і абмеры. Верым, што калі даспее час для аднаўлення роспісаў Слонімскай сінагогі, наша дакументацыя спатрэбіцца. А зрабілі яе мы яшчэ чвэрць стагоддзя таму!

**ФС:** Адкрытыя фрагменты жывапісу ў слонімскай сінагоге — гэта толькі невялікая частка: там ёсць некалькі слаёў. Астатнія або страчаны, або знаходзяцца пад пазнейшымі слаямі фарбы.

Сучасная гісторыя сінагогі хваляпадобная, і аптымістычным яе этапам не раз папярэднічаў спад. Летась у камяніцы зноў з'явілася гаспадыня — што не можа не абнадзейваць. А пакуль сумесна з Цэнтрам беларуска-яўрэйскай культурнай спадчыны, нам удалося зрабіць 3D-рэканструкцыю насценных роспісаў і наладзіць віртуальную экскурсію рэканструкцыі сінагогі.

**ІК:** У Лошыцы мы працавалі каля дваццаці гадоў — днямі і начамі, на валанцёрскіх умовах. У савецкі час нават гутаркі не вялося пра аднаўленне сядзібы, і на пачатку ў нас была адзіная мэта — зафіксаваць роспісы інтэр'ера. Пэўна, ні па адным аб'екце не было назапашага столькі навуковай дакументацыі — 35 тамоў! І калі была завершана праца, мы везлі яе заказчыку на трох тачках.

**ІМ:** Шкада, вядома, што ўласнік не паслухаўся ні нас, ні навуковага кіраўніка Галіну Левіну, і аўтэнтычны будынак быў разабраны.

**ФС:** У Лошыцы страчана шмат аўтэнтычных элементаў — дзверы, кранштэйны... І, вядома, узоры тых унікальных тэхналогій, якімі карысталіся не толькі пры аздабленні, але і пры будаўніцтве дома. Там кожны пакой меў уласны стыль. Уяўляю, якога ўзроўню майстры ў свой час гэта рабілі! Вядома, варта было б паказаць гэта ўсё. Старадаўнія тэхналогіі таксама важныя, а не толькі вонкавая карцінка. Хаця б таму, што яны памнажаюць наш досвед.

**— Як матываваць сябе, калі ты бачыш, што энтрапія часам бярэ верх?**

**ІК:** Тут галоўнае — самому не рассыпацца. І менавіта таму мы зладзілі гэтую выставу. Хаця многім даводзілася тлумачыць, навошта нам гэта трэба.

**ФС:** Помнікі захаваюцца толькі тады, калі будуць іх захавальнікі, ніхто іншы за нас гэтага не зробіць. А калі ты сам на сабе крыж паставіў — значыць, на адну "баявую адзінку" меней. Мы гэта разумеем, таму дух у нас заўсёды бадзёры.

К

**Здымкі прадстаўленыя Фёдарам Сарокам.**

## МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. Леніна, 20.*
*Тэл.: 397 01 63 (экскурсійнае бюро)*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Вялікія мары маленькіх людзей"**. (жывапіс Валянціна Губарава) — да 18 ліпеня.

■ **"Фердынанд Рушчыц"**: віртуальная выстава да 150-годдзя з дня нараджэння.
■ Віртуальная выстава твораў Віталя Чарнабрысава **"Вангогісты Гаген"**.
■ Выстава **"Літаратурны пейзаж"** (графіка з фондаў Дзяржаўнага мемарыяльнага гісторыка-літаратурнага і прыродна-ландшафтнага музея-запаведніка А.С. Пушкіна "Міхайлаўскае" — да 15 жніўня.
■ Выстава Уладзіміра Мурахвера "Шкло", прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння — да 30 жніўня.

*Філіялы музея*

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.*
*Тэл.: 358 88 78*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Повязь часоў"**, якая знаёміць з багаццем вобразаў традыцыйнага ручніка.
■ **Займальныя майстар-класы** па саломапляценню, вырабу традыцыйных лялек, пляценні паясоў (бранзалетаў). Патрапіць на майстар-клас можна ў любы працоўны дзень музея: серада-нядзеля з 10.00 да 17.00. Папярэдні запіс абавязковы.
■ Фотапраект італьянскага мастака Паола Ладамада **"AFRICA SOUL"** — да 31 жніўня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск,вул. Некрасава, 3*
*Тэл.: 399-09-79*
*Час працы: серада-нядзеля цз 12:00 да 20:00*
■ Выстава-вынік праекта **"Чорным па белым"**.
*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47*
*Тэл.: 242-78-14*
*Час працы: аўторак-нядзеля 12.00-20.00*
■ Выстава **"GENIUS LOCI. GENIUS LOST"** — да 1 жніўня.
■ Выставачны праект "Адкрыты праект VL" — да 29 жніўня.
■ Персанальная выстава графікі Юрыя Якавенкі **"Астральны нацюрморт"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.*
*Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66. Музей працуе: аўторак, серада, пятніца, субота, нядзеля — з 10.00 да 18.00 (касы да 17.30), чацвер — з 12.00 да 20.00 (касы да 19.30) панядзелак — выхадны.*
■ Пастаянная экспазіцыя.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.*
*Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.*
*Палацавы ансамбль*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Захавальнікі"** (куфры, шкатулкі, скрыні) — да 20 верасня.
■ Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.
■ Выставачны праект "Адбіткі часу і веры" — да 30 чэрвеня.
*Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці*
*Вул. Гейсіка, 1.*

*Ратуша*
*г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3.*
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.*
*Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя"**.
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…"**, **"Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак"**, **"Капрызы моды ракако"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.
■ **Квэст "Таямніца двух куфраў"**.

**ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"**
**звяртайцеся па тэлефоне**
**+ 375 17 286 07 97**
**і па тэлефоне/факсе**
**+375 17 334 57 41**
**альбо пішыце на электронны адрас**
**kultura@tut.by!**

## ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
*г. Мінск, вул. Казлова, 3.*
*Тэл./факс: 290 60 10.*
■ Галоўны праект рэспубліканскага фестывалю манументальнага мастацтва Беларускага саюза **"Манумент"**.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

| магазіны "Белсаюздрук" | кіёскі "Белсаюздрук" |
|---|---|
| Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына". | ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча. |
| Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі". | Праспект Пераможцаў, 5. |
| Праспект Незалежнасці, 44. | Вуліца Рабкораўская, 17. |
| Вуліца Валадарскага, 16. | Праспект Незалежнасці, 68, В. |
| | Вуліца Лабанка, 2. |

*Тэлефон для даведак па наяўнасці газеты ў кіёсках "Белсаюздрук" — (017) 2764542 (з 9.00 да 17.30)*

# "Узводзіць масты, а не сцены!"

*Заканчэнне. Пачатак — на старонке 1.*

Узнагароду "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення", заснаваную ў 2009 годзе, павінен быў атрымаць з рук Прэзідэнта народны артыст Расіі Мікалай Баскаў. Спеваку, што прыязджае на наш фестываль з 1999 года, была закладзена імянная пліта на Плошчы зорак перад віцебскім Летнім амфітэатрам, артыст удзельнічаў у гэтай цырымоніі. Але ўвечары ў яго ўзнялася тэмпература, і ў гала-канцэрце адкрыцця форуму ён выступіць не змог.

Да юбілею фестываля было падрыхтавана шмат цікавостак. Былі выдадзены даведнік "Славянскі базар у Віцебску. Трэцяе дзесяцігоддзе", каталог фірмовага стылю і сцэнаграфіі фестывалю. У цэнтры горада з'явіліся новыя фотазоны — вялізны металічны кантрабас і рознакаляровы паўлін. Змянілася цырымонія ўзнясення фестывальнага сцяга. Калі раней яна непасрэдна папярэднічала закладанню імянной зоркі, дык цяпер была перанесена на таямнічую апоўнач, сімвалізуючы нараджэнне новага дня, у які будзе ўрачыста адкрыты юбілейны фэст. А тыя, хто прыязджае на яго 14 і больш гадоў, атрымалі так званы "валошкавы пашпарт" — гэткае сувенірнае пасведчанне, якое, зразумела, не замяняе сапраўдны дакумент.

Свае ўзнагароды падрыхтавала і Саюзная дзяржава. Спецыяльнымі дыпломамі Пастаяннага Камітэта СД "За творчае ўвасабленне ідэй дружбы народаў Беларусі і Расіі" былі адзначаны галоўны гукарэжысёр Цэнтра культуры "Віцебск" Руслан Стаброўскі, галоўны дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Беларусі Віталь Кульбакоў, народны артыст СССР, альтыст і дырыжор Юрый Башмет, генеральны дырэктар Дзяржаўнага цэнтральнага музея сучаснай гісторыі Расіі Ірына Веліканава.

Спецыяльныя ўзнагароды Саюзнай дзяржавы будуць па традыцыі ўручаны і канкурсантам "Славянскага базару ў Віцебску", якія прадстаўляюць Беларусь і Расію. Дарэчы, абодва конкурсы — дзіцячы і дарослы — пачнуцца акурат сёння. І калі вы не зможаце патрапіць на іх жыўцом, сачыце за імі ў тэлетрансляцыях.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

## ТЭАТРЫ

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"**
*г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.*
■ **17 — "Лялечны карагод"** (інтэрактыўна-пазнавальны спектакль на 1 дзею). Пачатак у 16.00.
■ 18 — **"Калабок"** (казка-гульня на 1 дзею). Пачатак у 16.00.

Увага! Аб'ява*

**Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад:**

**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – кларнэт – 1 чал.;**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – габой – 1 чал.;**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – гітара – 1 чал.;**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – саксафон – 1 чал.;**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – скрыпка – 1 чал. (на час сацыяльнага адпачынку па дагляду за дзіцём да дасягнення ім узросту трох гадоў);**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – скрыпка – 2 чал.;**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – альт – 1 чал.;**
**артыст эстрадна-сімфанічнага аркестра – кантрабас – 1 чал.**

У конкурсе могуць прыняць удзел музыканты з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія валодаюць неабходнымі навыкамі і практыкай ігры ў аркестравым калектыве.

Жадаючыя прыняць удзел у конкурсе прадастаўляюць пісьмовую заяву у адміністрацыю Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.

**Да заявы прыкладаюцца:**
**1. асабісты лісток па ўліку кадраў;**
**2. аўтабіяграфія;**
**3. копія дыплома аб вышэйшай ці сярэдне-спецыяльнай адукацыі;**
**4. характарыстыка з апошняга месца працы або навучання;**
**5. копія пашпарта;**
**6. фатаграфія для дакументаў 3*4;**
**7. праграма выступа да 15 хвілін: буйная форма і п'еса**

Удзельнікі конкурсу падаюць вышэйназваныя дакументы з паметкай "На конкурс у Адміністрацыю Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь" да 16.09.2021.

**ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.**

**З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").**